Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

1 ЛІСТАПАДА 2008 г.
СУБОТА
№ 208 (26321)

Кошт 450 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

БПМ змяншаецца. Пенсіі і дапамогі — не

Урад зацвердзіў новыя бюджэты пражыткавага мінімуму. У прыватнасці, як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны, з 1 лістапада «сярэдні» памер БПМ на члена сям'і з 4 чалавек складае Br223 660.

Новыя бюджэты пражыткавага мінімуму вызначаны ў цэнах верасня. У параўнанні з папярэднім паказчыкам «сярэдні» БПМ зменшыўся — дагэтуль ён складаў 224 700 рублёў. Як адзначыла ў гутарцы з карэспандэнтам «Звязды» **начальнік упраўлення дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкі насельніцтва Валянціна СЯРГЕЕВА**, «планка патрэбы» для прадастаўлення адраснай сацыяльнай дапамогі на бліжэйшыя тры месяцы застанецца ранейшай — 224 700 рублёў. Нягледзячы на змяншэнне «сярэдняга» БПМ, з 1 лістапада захаваюцца ранейшыя памеры мінімальных, сацыяльных пенсій, надбавак і павышэнняў да іх, а таксама памеры аднаразовых дапамог пры нараджэнні і штомесячных дапамог па доглядзе дзяцей ва ўзросце да 3 гадоў. Апошняя дапамога складае цяпер 179 760 рублёў. З 1 лістапада крыху (на 0,2 працэнта) павялічваецца мінімальны спажывецкі бюджэт. Яго новы памер вызначаны ў 346 190 рублёў. Гэты паказчык будзе выкарыстоўвацца для вызначэння права на атрыманне льготных крэдытаў на будаўніцтва жылля.

Сяргей ГРЫБ.

Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь БАТУРА Барыс Васільевіч

Фота БЕЛТА.

Нарадзіўся ў 1947 г. у г. Ваўкавыску Гродзенскай вобласці.

Адукацыя — вышэйшая — у 1970 г. закончыў Беларускі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга політэхнічны інстытут.

Працоўную дзейнасць пачаў у 1970 г. Працаваў майстрам цэха, інжынерам-тэхнолагам, выконваючым абавязкі начальніка аддзела тэхнічнага кантролю ўстановы УЖ-15/11 УУС Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта.

У 1973 — 1979 гг. — начальнік Ваўкавыскага камбіната камунальных прадпрыемстваў упраўлення камунальнай гаспадаркі Гродзенскага аблвыканкама. У 1979 — 1983 гг. — намеснік начальніка, начальнік аддзела механікі і энергетыкі, намеснік начальніка ўпраўлення жыллёва-камунальнай гаспадаркі Гродзенскага аблвыканкама. З лютага 1983 г. па красавік 1984 г. працаваў першым намеснікам начальніка вытворчага ўпраўлення жыллёва-камунальнай гаспадаркі Гродзенскай вобласці, з красавіка 1984 г. па жнівень 1987 г. — начальнікам вытворчага ўпраўлення жыллёва-камунальнай гаспадаркі пры Гродзенскім аблвыканкаме. У 1987 — 1990 гг. — намеснік Міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі БССР, намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама. З ліпеня 1990 г. па чэрвень 1999 г. быў Міністрам жыллёва-камунальнай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь. У 1999 г. назначаны намеснікам Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь, з лістапада 2000 г. — старшынёй Магілёўскага абласнога выканаўчага камітэта.

З'яўляўся членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога і трэцяга скліканняў.

Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны», ордэнамі Айчыны III ступені і Айчыны II ступені, юбілейным медалём «90 гадоў Узброеных Сілаў Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, ордэнам святіцеля Кірыла Тураўскага, удастоены ганаровага звання «Заслужаны работнік сферы абслугоўвання Рэспублікі Беларусь».

31 кастрычніка 2008 года абраны Старшынёй Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання.

Намеснік Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь РУБІНАЎ Анатоль Мікалаевіч

Фота БЕЛТА.

Нарадзіўся ў 1939 г. у г. Магілёве.

У 1961 г. закончыў фізічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Пачаў працоўную дзейнасць у Інстытуце фізікі Акадэміі навук БССР, дзе прапрацаваў больш як 40 гадоў. Прайшоў шлях ад аспіранта да намесніка дырэктара па навуковай рабоце Інстытута фізікі НАН Беларусі, выконваў абавязкі акадэміка-сакратара аддзялення фізікі, матэматыкі і інфарматыкі Акадэміі навук БССР.

У 1965 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю, у 1972 г. — доктарскую. У 1991 г. выбраны акадэмікам Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Аўтар больш як 300 навуковых работ, 4 манаграфій і 65 вынаходак. Пад кіраўніцтвам А.М. Рубінава распрацаваны арыгінальныя лазерныя прыборы, якія адзначаліся дыпломамі і медалямі ВДНГ, былі ўдастоены залатога медаля Міжнароднага Лейпцыгскага кірмашу.

Адыграў вялікую ролю ў падрыхтоўцы і атэстацыі кадраў вышэйшай кваліфікацыі. Падрыхтаваў больш за 30 кандыдатаў і дактароў навук. З 2002 па 2006 г. узначальваў Вышэйшую атэстацыйную камісію Рэспублікі Беларусь. З 2006 па 2008 г. — Першы намеснік Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Заслужаны дзеяч навукі Беларускай ССР (1980). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1972) і Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь (1994).

Узнагароджаны ордэнам Францыска Скарыны (2000).

Жанаты, мае дваіх дзяцей.

31 кастрычніка 2008 года выбраны Намеснікам Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання.

У Савеце Рэспублікі

«СУПРАЦЬ» — НЯМА!

Кіраўніком ніжняй палаты парламента нядаўна быў абраны экс-старшыня Віцебскага аблвыканкама Уладзімір Андрэйчанка, а ўчора крэсла старшыні верхняй палаты заняў Барыс Батура, які апошнія восем гадоў кіраваў Магілёўшчынай

У новым складзе Савета Рэспублікі на сёння — 56 сенатараў (адзін з іх прызначаны кіраўніком дзяржавы, а астатнія абраныя дэпутатамі мясцовых Саветаў). Нагадаем, што прэзідэнцкая квота ў прызначэнні сенатараў дагэтуль не вычарпаная. Лідзія Ярмошына падзялілася з журналістамі меркаваннем аб тым, што на гэту пасаду можа быць прызначаны новы губернатар Віцебшчыны. «Традыцыйна кіраўнік рэгіёна засядае ў Савеце Рэспублікі», — патлумачыла яна.

Пакуль што сярод дзеючых членаў Савета Рэспублікі — 19 жанчын, 16 сенатараў з вопытам (яны працавалі ў папярэдніх скліканнях), 14 прадстаўнікоў дзяржаўных органаў, 12 уладальнікаў навуковых ступеняў і званняў, трое рэктараў.

Спікерам верхняй палаты абраны Барыс Батура, які апошнія восем гадоў узначальваў Магілёўскі аблвыканкам. Супраць яго кандыдатуры (дарэчы, адзінай на гэтую пасаду, не было альтэрнатывы і пры галасаванні за прэтэндэнтаў на пасады віцэ-спікера, а таксама кіраўнікоў камісій) не прагаласаваў ні адзін з дзеючых сенатараў.

Цікава, што прэтэндэнта на пасаду спікера прапанаваў экс-спікер Генадзь Навіцкі (у новым скліканні калегі даверылі яму курыраваць работу Камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні). Лідзія Ярмошына не ўтрымалася ад каментарыя: «Сімвалічна, што кандыдатуру на пасаду старшыні вылучае старшыня сышоўшага склікання. Як казала геаграфія аднаго вядомага фільма, «высокія адносіны». Гэта вельмі прыемна». А ад сябе, як ад прадстаўніка Магілёўскай вобласці, старшыня Цэнтрвыбаркама дадала: «У Барыса Васільевіча ёсць тое, што дазваляе камфортна адчуваць сябе з ім любому калектыву, — пачуццё гумару. Гэта вельмі важна для кіраўніка». І ў наяўнасці яго ў новага спікера ўдзельнікі пасяджэння хутка змаглі ўпэўніцца. Перагортваючы паперы і тлумачачы паўзу ў працэдурных момантах, новы спікер з усмешкай заўважыў: «Мы ж пакуль вучымся (маецца на ўвазе разам з намеснікам — Анатолем Рубінавым. — **Аўт.**), вось і вывучаем, што далей нам рабіць».

Шчыры камплімент атрымаў новы спікер і ад Аляксандра Якабсона, кіраўніка Гомельшчыны, які выступаў у падтрымку кандыдатуры Барыса Батуры: «Ён яшчэ і імпазантны мужчына — калі жанчыны міма яго праходзяць, дыханне пачашчаецца». Сапраўды, відаць, пры такім кіраўніку ўсе пераключаюцца на жартоўную хвалю. А ў такой атмасферы і працаваць куды лягчэй, пагадзіцеся.

Якія прыярытэты вылучае ў будучай працы новы кіраўнік Савета Рэспублікі? Ён адзначыў, што будзе прадоўжана актыўная работа па будаўніцтве Саюзнай дзяржавы і інтэграцыі на постсавецкай прасторы, развіцці ўзаемадзеяння з міжпарламенцкімі аб'яднаннямі.

— Гістарычная роля і прадвызначэнне парламента — у тым, каб забяспечыць стабільнае развіццё грамадства і не дапусціць сацыяльна-эканамічных патрасенняў, — падкрэсліў Барыс Батура. — Для мяне відавочна, што дзейнасць парламента можа быць па-сапраўднаму эфектыўнай толькі тады, калі ён у поўнай меры ўзаемадзейнічае з усімі галінамі ўлады і адчувае падтрымку народа. Толькі так можна ўмацаваць заканадаўчы падмурак дзяржавы. Заканатворчасць павінна ісці ў нагу з часам, нам давядзецца ўзяць удзел у стварэнні законаў новага пакалення — навукова абгрунтаваных і дэталёва выверaных. Савет Рэспублікі павінен разглядаць законы з пункту гледжання іх якасці, адпаведнасці канстытуцыйным каштоўнасцям, дзяржаўнай палітыцы, а таксама надзённым патрэбам людзей. Неабходна выпрацаваць механізмы, якія б максімальна стымулявалі работу органаў мясцовага самакіравання — менавіта на мясцовым узроўні знаходзяць вырашэнне самыя актуальныя паўсядзённыя праблемы грамадзян.

Адным з галоўных накірункаў дзейнасці Савета Рэспублікі чацвёртага склікання, на думку спікера, павінна быць «работа са зваротамі грамадзян і юрыдычных асобаў…».

Кандыдатуру на пост свайго намесніка прапанаваў сам старшыня верхняй палаты. Яго выбар і выбар яго новых калег (рашэнне па кандыдатуры было адзінагалосным) выпаў на Анатоля Рубінава — першага намесніка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта. Віцэ-спікер падкрэсліў, што новаму скліканню давядзецца працаваць у няпростых умовах. У гэтай сувязі ён прыгадаў праблемы ў Грузіі, фінансавы крызіс, усталяванне адносінаў з Еўропай і Амерыкай. «Мы будзем працаваць у перыяд прэзідэнцкіх выбараў — гэта вельмі адказна. Трэба ўлічваць перспектывы. Нашы рашэнні павінны быць стратэгічна выверанымі». Анатоль Рубінаў зрабіў акцэнт і на неабходнасці даводзіць сутнасць законапраектаў да насельніцтва, здымаць напружанне ў грамадстве, каб яны потым не трактаваліся «ў не патрэбным нам ключы».

Каардынаваць дзейнасць Камісіі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве будзе Яўген Смірноў. Экс-спікер ніжняй Палаты прадстаўнікоў Вадзім Папоў абраны старшынёй Камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах. Ён звярнуў увагу на «застарэлую хваробу» айчыннай эканомікі — «у нас няма Спецыяльнай часткі Падатковага кодэкса, і мы штогод рамантуем падатковае заканадаўства разавымі законамі».

На кіруючых пастах у Савеце Рэспублікі будуць і прадстаўніцы «слабой паловы»: Антаніна Морава ўзначаліць Камісію па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, а Ніна Мазай — Камісію па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы. Спадарыня Морава (экс-міністр працы і сацыяльнай абароны), выступаючы перад сенатарамі, адзначыла мэтазгоднасць пераходу ў палітыцы краіны ад сацыяльнага ўтрымання да сацыяльнай гарантыі. «Мы пераходзім да так званай субсідыярнай мадэлі, калі за свой асабісты дабрабыт адказвае як чалавек, так і дзяржава. Дзяржава вызначае законы, якія неабходныя для таго, каб чалавек сваёй працай мог дасягнуць годнага ўзроўню жыцця». Быў зацверджаны і персанальны склад пастаянных камісій.

Ала МАЧАЛАВА.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА: «У БЕЛАРУСІ КРЫЗІСУ НЯМА І ДЗЯРЖАВА НЕ ПАЦЕРПІЦЬ УТРЫМАНСКАЙ ПАЗІЦЫІ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ»

Прэзідэнт Беларусі разгледзеў кадравыя пытанні.

Аляксандр Лукашэнка назначыў:

Абламейку Сяргея Уладзіміравіча — рэктарам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта,

Гайсёнка Віктара Анатольевіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Польшча,

Шастакова Яўгена Андрэевіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Італьянскай Рэспубліцы, Пастаянным прадстаўніком Рэспублікі Беларусь пры Харчовай і сельскагаспадарчай арганізацыі Аб'яднаных Нацый па сумяшчальніцтве.

У сувязі з пераўтварэннем Міністэрства статыстыкі і аналізу ў Нацыянальны статыстычны камітэт кіраўнік дзяржавы назначыў першым намеснікам старшыні Белстата **Касцевіч Ірыну Анатольеўну**, намеснікамі старшыні — **Кухарэвіч Алену Іванаўну, Мецежа Уладзіслава Станіслававіча, Міхно Віктара Георгіевіча,** намеснікам старшыні — начальнікам упраўлення перапісу насельніцтва **Навасёлаву Святлану Уладзіміраўну.**

Прэзідэнт даў згоду на назначэнне:

Засноўскага Сяргея Васільевіча — генеральным дырэктарам рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Гомельтранснафта Дружба»,

Пузевіча Сяргея Міхайлавіча — генеральным дырэктарам адкрытага акцыянернага таварыства «Магілёўхімвалакно»,

Нягоцькі Генадзя Антонавіча — дырэктарам адкрытага акцыянернага таварыства «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа»,

Тураўца Сцяпана Пятровіча — генеральным дырэктарам рэспубліканскага ўнітарнага вытворчага прадпрыемства «Граніт»,

Максімава Васіля Міхайлавіча — старшынёй Камітэта дзяржаўнага кантролю Віцебскай вобласці,

Лашына Аляксандра Міхайлавіча — намеснікам генеральнага пракурора Рэспублікі Беларусь,

Курдзекі Аляксандра Паўлавіча — рэктарам установы адукацыі «Беларуская дзяржаўная ордэнаў Кастрычніцкай Рэвалюцыі і Працоўнага Чырвонага Сцяга сельскагаспадарчая акадэмія»,

Вараб'я Уладзіміра Леанідавіча — генеральным консулам Рэспублікі Беларусь у г. Шанхаі (Кітайская Народная Рэспубліка),

Амарына Уладзіміра Віктаравіча — першым намеснікам міністра фінансаў,

Куліка Віталя Васільевіча — намеснікам міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя,

Русецкага Аляксандра Пятровіча — намеснікам старшыні Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях,

Грушы Мікалая Міхайлавіча — дырэктарам Дэпартамента па ядзерным энергетыцы Міністэрства энергетыкі,

Дзядкова Леаніда Мікалаевіча — членам Брэсцкага аблвыканкама,

Найдзенкі Аляксандра Ціханавіча — членам Віцебскага аблвыканкама,

Саўчыца Івана Аляксандравіча — членам Мінскага аблвыканкама,

Фармагея Леаніда Канстанцінавіча — членам Мінскага гарвыканкама,

Балейкі Фёдара Фёдаравіча — членам Магілёўскага аблвыканкама.

Звяртаючыся да работнікаў вытворчасці, Прэзідэнт падкрэсліў: прадпрыемствы павінны сёння не чакаць дапамогі ад дзяржавы, а разлічваць на сябе. «Сёння пад шумок сусветнага крызісу некаторыя кіраўнікі расслабіліся і лічаць, што можна працаваць спусціўшы рукавы. Бачачы, што ў многіх краінах свету акумулююцца сродкі і перадаюцца суб'ектам гаспадарання, нашы кіраўнікі думаюць: а чаму б не пажывіцца за кошт якіх-небудзь датацый або бюджэту? Я папярэдзіў ужо міністраў і ўрад: дзяржава не будзе цярпець утрыманскай пазіцыі прадпрыемстваў, незалежна ад формы ўласнасці», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

«На працягу лістапада мы будзем уваходзіць у курс справы таго або іншага прадпрыемства, будзем глядзець, чым можна дапамагчы. Але ўжо з 1 снежня прадпрыемствы павінны пачаць вяртанне дапамогі. Вы павінны будзеце вярнуць дзяржаве, народу тое, што будзе прапанавана вам. Таму не трэба разлічваць, што на хвалі гэтага так званага крызісу можна будзе папраўдзе свае справы. Цяпер трэба разлічваць толькі на сябе. У выпадку ўзнікнення некаторых цяжкасцяў мы будзем дапамагаць толькі тым прадпрыемствам, якія разлічваюць перш за ўсё на калектыў, уласныя сілы і рэзервы».

Аляксандр Лукашэнка пагадзіўся з думкай, што выказваецца ў многіх сродках масавай інфармацыі, аб тым, што цяперашні сусветны фінансавы крызіс у нейкай ступені можа быць карысны. «Але ён карысны толькі моцным. Гэта праверка, экзамен для эканомікі, улады і кіраўнікоў прадпрыемстваў. Калі кіраўнікі чагосьці вартыя, то яны павінны вытрымаць гэты крызіс. Я папярэдзіў членаў урада: у краіне крызісу няма і ні аб якім крызісе размова ісці не будзе. У эканоміцы важны псіхалагічны фактар, і ні ў кога не атрымаецца запакойваць сябе тым, што, маўляў, цяжка, крызіс, значыць можна знізіць вытворчыя паказчыкі і не плаціць зарплату людзям. Гэта не прымаецца», — заявіў Прэзідэнт.

Самае галоўнае, паводле яго слоў, уважліва паглядзець на бюджэты прадпрыемстваў і ўсвядоміць, што вытворчасць і зарплата — гэта прыярытэт. Усе другарадныя расходы павінны быць урэзаны.

«Многім нялёгка, але вырашаць задачы трэба, і мы павінны дасягнуць пастаўленых мэтаў. Шукайце рынкі і самі прасоўвайце прадукцыю, а не чакайце ля прахадной, што прыедуць расіяне і ўсё купяць. Трэба дзейнічаць вельмі аператыўна».

У размове з Васілём Максімавым і Аляксандрам Лашыным Прэзідэнт заклікаў іх сумленна і прынцыпова выконваць ускладзеныя на іх абавязкі. «Вы кампетэнтныя людзі і добра валодаеце сітуацыяй».

У пракуратуры ёсць пэўныя кадравыя праблемы, не хапае канкрэтных і рашучых дзеянняў па спыненні правапарушэнняў, асабліва ў частцы барацьбы з карупцыяй.

«Мы будзем удзяляць першаradную ўвагу кадравым пытанням у пракуратуры. На жаль, ёсць яшчэ факты пакрывання пракурорамі чыноўнікаў, якія ўчынілі карупцыйныя правапарушэнні. Мы будзем вельмі жорстка з гэтым змагацца. Дараванняў тут нікому не будзе».

Кіраўнік дзяржавы канстатаваў, што ў галіне арганізацыі сельгасвытворчасці ў Беларусі ёсць пазітыўныя змяненні. «Шмат робіцца, гэты вопыт трэба бачыць і абагульняць, а гэта якраз справа навукі, якая заўсёды была магутным звяном у Беларускай дзяржаўнай ардэнаў Кастрычніцкай Рэвалюцыі і Працоўнага Чырвонага Сцяга сельскагаспадарчай акадэміі. У гэтай ВНУ ёсць добрая матэрыяльная і навучальна-вытворчая база. І акадэміі патрэбны моцны кіраўнік».

Як падкрэсліў Прэзідэнт, назначаючы новага рэктара БДУ, неабходна павышаць аўтарытэт гэтай навучальнай установы. Паводле яго слоў, асаблівую ўвагу неабходна ўдзяліць больш ценаму развіццю сувязі навукі і адукацыі, выразнэнню сумесна з НАН навуковых і практычных задач для ўсіх галін народнай гаспадаркі краіны.

На думку кіраўніка дзяржавы, у дзейнасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ёсць сёння пэўныя недахопы. «Хацелася б большай эфектыўнасці ў БДУ, для гэтай ВНУ дзяржава шмат зрабіла. Універсітэт павінен сам зарабляць грошы, у тым ліку і вытворчасцю канкрэтнай прадукцыі. На працягу гадавдвух БДУ трэба вывесці на вядучыя пазіцыі. І гэта ВНУ павінна рэальна даваць якасную адукацыю».

Прэзідэнт адзначыў, што Беларусь цяпер павінна будаваць адносіны з Польшчай у эканамічнай і палітычнай сферы як усебаковыя і комплексныя. Акрамя таго, ёсць шэраг важных задач па развіцці ўзаемадзеяння ў сферы навукі, адукацыі, прыгранічнага і мытнага супрацоўніцтва.

Кіраўнік дзяржавы канстатаваў, што апошнім часам ёсць пэўныя зрухі па развіцці ўзаемаадносінаў з Італіяй, Францыяй, Германіяй, Вялікабрытаніяй, і пазітыўную тэндэнцыю неабходна замацаваць. «Італія — гэта вельмі важны напрамак. Нам вельмі хацелася б мець важкія практычныя канкрэтныя вынікі ў супрацоўніцтве з гэтай краінай, і для гэтага трэба зрабіць усё неабходнае», — лічыць Прэзідэнт.

«Што датычыцца Кітая, то гэта — прыярытэтная і дружалюбная нам краіна, дзяржава, якая падтрымлівае нас па ўсіх напрамках. Гэта вялікі рынак з растучай эканомікай, там ёсць вялікія магчымасці для работы», — перакананы Аляксандр Лукашэнка.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

Учора здарыўся пажар на тэрыторыі Мінскага холадакамбіната № 2: загараўся дах тэхналагічнага цэха. Пажар патушаны.

Арганізацыі Міністэрства інфармацыі за студзень—верасень выканалі 9 з 13 прагнозных паказчыкаў

Арганізацыі Міністэрства інфармацыі Беларусі за 9 месяцаў гэтага года выканалі 9 з 13 прагнозных паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця галіны, устаноўленых урадам. Аб гэтым паведаміла першы намеснік міністра інфармацыі Лілія АНАНІЧ на пасяджэнні калегіі ведамства.

Аб'ём вытворчасці прамысловай прадукцыі за названы перыяд склаў 113,3 працэнта да ўзроўню 9 месяцаў мінулага года, вытворчасць спажывецкіх тавараў — 115 працэнтаў, аб'ём экспарту — 113 працэнтаў, аб'ём імпарту — 120 працэнтаў. Тэмп росту рознічнага тавараабароту дасягнуў 122,3 працэнта да аналагічнага перыяду мінулага года, аб'ём аказаных платных паслуг насельніцтву — 112,9 працэнта.

БЕЛТА.

Минский городской центр недвижимости

Минский городской центр недвижимости

ПРИГЛАШАЕТ К УЧАСТИЮ В АУКЦИОНАХ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ НЕДВИЖИМОСТИ:

- торгового помещения на проспекте Независимости, 40 (65,1 кв.м). Начальная цена 1 240 000 000 рублей. Аукцион состоится **18.11.2008**;
- производственного помещения на ул. Лукьяновича, 10 (194,1 кв.м). Начальная цена 360 000 000 рублей;
- административного и вспомогательного (котельная) зданий ОАО «Белаттракцион» на ул. Могилевской, 68 (304,8 кв.м и 69 кв.м, земельный участок – 0,1733 га). Начальная цена 939 275 420 рублей. Аукцион состоится **11.11.2008;**
- детского оздоровительного лагеря «Бригантина» (земельный участок – 11,75 га). Начальная цена 2 133 716 497 рублей. Аукцион состоится **26.11.2008**.

Телефоны для справок:
(017)227 48 36, (017)227 40 22
(сайт: www.mgcn.by).

УНП 190398583

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

РАКЕТЫ — ПРАЗ ЧАТЫРЫ ГАДЫ

Першыя ракеты сістэмы ПРА ЗША могуць з'явіцца ў Польшчы прыкладна праз чатыры гады пасля таго, як Сейм ратыфікуе польска-амерыканскі дагавор аб стварэнні ў Польшчы амерыканскай базы ПРА. Аб гэтым заявіў у пятніцу амерыканскі генерал Патрык А'Райлі, які займае пасаду дырэктара амерыканскага агенцтва па супрацьракетнай абароне.

«Мы павінны пачакаць ратыфікацыі дагавора, затым нам спатрэбіцца тры гады на будаўніцтва базы і яшчэ год на разгортванне ўсёй сістэмы», — сказаў ён. Генерал таксама выказаў меркаванне, што эканамічны крызіс не паўплывае на тэмпы будаўніцтва ў Польшчы амерыканскай базы ПРА.

ЛЕПШЫЯ АНТЫВІРУСЫ

Па выніках тэста антывірусаў на лячэнне камп'ютара ад актыўнага заражэння, праведзенага незалежным парталам Anti-Malware.ru, лепшымі прадуктамі ў гэтай катэгорыі прызнаныя Dr.Web, «Антывірус Касперскага» і Avast Antivirus. У лік аўтсайдараў патрапілі McAfee VirusScan, Trend Micro Antivirus plus Antispyware і Eset NOD32 Antivirus, якія апынуліся «непрыдатныя» для лячэння складаных выпадкаў.

ЛЮДЗІ ПАЦЯМНЕЮЦЬ, БУДУЦЬ З РАСКОСЫМІ ВАЧАМІ І БЕЗ ЗУБОЎ

Эвалюцыя чалавечага віду зусім не скончылася, сцвярджаюць вучоныя, а значыць, наперадзе нас чакаюць новыя мутацыі. Прычым чым больш на гэтай планеце будзе з'яўляцца гараджан, тым хутчэй будуць адбывацца генетычныя змены ў нашых арганізмах.

Так, нядаўна французскія навукоўцы падлічылі, што нюх у нас ужо стаў значна горшы, чым у продкаў: 72 працэнты генаў, якія адказваюць за нюх, ужо муціравалі. Пакуль гэтыя адрозненні не кідаюцца ў вочы, але з цягам часу, сцвярджаюць некаторыя навуковыя, нос і зусім атрафіруецца. Не ўсё ў парадку будзе і з зубамі. Хутчэй за ўсё яны ў нас спачатку здрабнеюць, а потым знікнуць зусім: у эпоху татальных кансервантаў, багацця цукроў і адсутнасці грубай ежы магутныя сківіцы і вялікія разцы чалавеку будуць проста не патрэбныя.

Аднак калі атрафія зубоў — гэта не самая наша найбліжэйшая будучыня, то некаторыя іншыя вонкавыя змены праявяцца ўжо пры нашым жыцці. Так да сярэдзіны XXI стагоддзя жыхары Зямлі ў масе сваёй значна пацямнеюць скурай і абзавядуцца раскосымі вачамі. Такая будзе плата за ашалелую нараджальнасць у азіятаў і афрыканцаў і антыбэбібум у еўрапоіднай расы. Не трэба быць антраполагам, каб пераканацца ў гэтым прагнозе. Досыць прайсціся па любым буйным еўрапейскім горадзе.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 1.11.2008 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 120,00
1 еўра	2 697,06
1 латвійскі лат	3 801,67
1 літоўскі літ	781,12
1 чэшская крона	111,80
1 польскі злоты	741,52
1 расійскі рубель	78,23
1 украінская грыўня	358,26

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	27,0981
10 UAH	34,4092
1000 BYR	12,8214
EUR	45,2767

Курс у гандлёвых кампаніях (на 31.10.2008 г.)

USD	2135 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Грэцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Грэцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

«Зайцы» па віне чыгункі

30 кастрычніка а 8-й гадзіне раніцы каля чыгуначных кас на прыпынку электрычкі «Масюкоўшчына» ўтварыўся вялікі натоўп разлаваных людзей.

Я прыбыў на прыпынак за 15 хвілін да адпраўлення электрацягніка і быў вымушаны стаць у канец даўжэзнай чаргі. Было дзіўна, што ў час пік працавала ўсяго адна касірка. Мне пашчасціла — за пару хвілін да адпраўлення я ўзяў білет і ўціснуўся ў вагон. Вядома, галоўнай тэмай абураных людзей была штучна створаная чарга ля касы. Людзі ўзгадвалі, што такія здарэнні даволі частыя на «Масюкоўшчыне».

Праз два-тры прыпынкі заходзяць кантралёры і пачынаюць патрабаваць праязныя білеты, у тым ліку і ў тых адчаюг, якія рызыкнулі сесці без білета. Вагон абурыўся. Па словах кантралёраў, такія выпадкі далёка не адзінкавыя. Яны сігналізуюць начальству, але тое не спяшаецца нешта мяняць з продажам білетаў. Пасажыры пачалі падказваць: можа на час пік павялічыць колькасць касірак, паставіць аўтаматы і г.д.

Станоўчым вынікам дыскусіі стаў дазвол кантралёраў ехаць «зайцам»... без білетаў. Ці толькі на карысць гэта чыгунцы? Няхай і дробныя грошы, але яна страціла.

Леанід ТУГАРЫН.

ЗБЕРАЖЭННІ:
НА АДНАГО ЖЫХАРА — 1,4 МЛН У БАНКАХ

У сярэднім на аднаго жыхара нашай краіны на пачатак кастрычніка ў банкаўскім сектары прыходзілася 1,4 мільёна рублёў зберажэнняў, што эквівалентна 661,8 долара ЗША, адзначалася на пашыраным пасяджэнні праўлення Нацыянальнага банка Беларусі. У параўнанні з пачаткам гэтага года зберажэнні насельніцтва ў банках істотна папоўніліся: так, на 1 студзеня 2008 года згаданы паказчык складаў 1,1 мільёна рублёў, ці 513 долараў ЗША, паведаміў карэспандэнту «Звязды» прэс-сакратар галоўнага банка краіны Міхаіл Журавовіч.

Ведучы гаворку аб далейшай працэнтнай палітыцы банкаў, удзельнікі пасяджэння прыйшлі да высновы, што яна ў сённяшніх умовах павінна быць максімальна арыентаваная на актывізацыю прыцягнення зберажэнняў насельніцтва. Як адзначалі банкаўскія спецыялісты, асноўную задачу — дасягненне мэтавых параметраў, вызначаных у асноўных напрамках грашова-крэдытнай палітыкі на 2008 год, давядзецца вырашаць на фоне знешнеэканамічнай сітуацыі, якая істотна ўскладнілася. Разам з тым імі было заўважана і тое, што ў Беларусі не маюць распаўсюджання высокарызыкоўныя фінансавыя інструменты, якія сталі прычынай узнікнення нестабільнасці на замежных рынках. Праўда, уздзеянне крызісу на замежныя прадпрыемствы і банкі здольна пацягнуць шэраг наступстваў і для беларускай эканомікі. А таму, сярод іншага, узрастаюць і патрабаванні да ўстойлівасці банкаўскага сектара. Так, кожны банк павінен надаць максімум увагі стараннаму планаванню ліквіднасці, захаванню нарматываў бяспечнага функцыянавання, падтрыманню ўстойлівасці рэсурснай базы і высокага ўзроўню якасці актываў, забяспечыць безумоўнае і своечасовае выкананне абавязацельстваў перад кліентамі.

Ігар ГРЫШЫН.

Генпракурор: узмацніць адказнасць за дачу хабару

«Іншым часам хабарадавальнікі прыцягваюцца да меншай адказнасці, чым хабарнікі. Мы лічым, што неабходна ўзмацніць адказнасць і тых, хто дае. За хабары ў буйных памерах апошнія гады выносіліся прыгаворы да 10 гадоў пазбаўлення волі, у той час як па заканадаўстве гэты тэрмін можа складаць да 15 гадоў», — адзначыў Рыгор Васілевіч. Генпракурор таксама прапанаваў, каб да асобаў, якія прыцягваліся да адказнасці за карупцыйныя злачынствы і асабліва за хабарніцтва, не прымяняўся закон аб амністыі.

БЕЛТА.

ВАЛЮТЧЫКАМ НЕ ДАДУЦЬ «РАЗГАРНУЦЦА»

Учора на аператыўнай нарадзе ў Міністэрстве ўнутраных спраў разглядалася пытанне ўдасканалення работы міліцыі са зваротамі грамадзян, у тым ліку са зваротамі па дакументы на аснове прынцыпу «аднаго акна».

Міністр унутраных спраў Уладзімір Навумаў выказаўся і па некаторых іншых пытаннях. Напрыклад, адносна тых, хто ў п'яным выглядзе садзіцца за руль. «Мая пазіцыя тут становіцца ўсё больш жорсткай, — падкрэсліў Уладзімір Уладзіміравіч. — Злоўжыванне алкаголем, тым больш за рулём, — напэўна, адна з самых нядобрых з'яў у нашым грамадстве. Я ставіўся б да такой катэгорыі вадзіцеляў яшчэ больш строга — і транспартны сродак канфіскаваў бы, і прыцягваў бы да больш жорсткай адказнасці...».

Міністр пацвердзіў, што ў краіне адрадзіўся «чорны» валютны рынак, і сказаў, што ўжо ў чацвер было падпісана абумоўленае на гэты раз «нехарактэрнымі беларускімі момантамі» распараджэнне, якое дапаможа выкараніць гэту з'яву. Лічыцца, што згаданая з'ява абумоўлена складаным фінансавай сітуацыяй у блізкіх Расіі і ва Украіне. Міністр упэўнены, што з гэтых краін у Беларусь будуць прыязджаць для таго, каб памяняць свае нацыянальныя грошы на долары: «...У нас ужо ёсць некалькі фактаў, калі расійскія грамадзяне прывозяць вялікія партыі грошай і імкнуцца памяняць на долары». Зразумела, што ў адказ на попыт з'явілася і прапанова, якую забяспечваюць валютчыкі. Дзеянні міністэрства па гэтым пытанні будуць узгадняцца з Нацыянальным банкам, каб прадухіліць «шырокія негатыўныя моманты». Асноўным жа відам пакарання для валютчыкаў застанецца пазбаўленне іх валюты.

Адносна расследавання па выбуху, ад якога на гарадскім свяце летам пацярпела нямала людзей, міністр сказаў, што любыя яго словы на гэту тэму будуць даваць магчымасць злачыннаму боку прымаць нейкія меры. Калі справа будзе раскрыта, прагучаць і падрабязнасці.

Што датычыцца ўласна пытання нарады, то перш за ўсё варта гаварыць аб устойлівай тэндэнцыі павелічэння колькасці зваротаў грамадзян у органы ўнутраных спраў. Сёлета за 9 месяцаў у цэлым па рэспубліцы зарэгістравана 350 тысяч заяў, што на трэць больш, чым летась. Абсалютная большасць зваротаў вырашаецца на месцах. Знізілася колькасць зваротаў па пытаннях дзейнасці органаў унутраных спраў, накіраваных у вышэйшыя інстанцыі. Знізілася і колькасць паўторных пісьмаў.

Прыём грамадзян па ўсіх накірунках дзейнасці арганізаваны штодня з такім рэжымам, каб заяўнікі мелі магчымасць звяртацца ў падраздзяленне ў любы зручны час, нават пасля завяршэння працоўнага дня або ў выхадны.

У прыёмных памяшканнях падраздзяленняў па грамадзянстве і міграцыі колькасць грамадзян, якія чакаюць прыёму, у сярэднім не перавышае 4-5 чалавек. Час абслугоўвання аднаго чалавека не перавышае 15 хвілін.

На фоне зніжэння колькасці скаргаў на дзеянні супрацоўнікаў міліцыі ў цэлым па краіне абгрунтаванай прызнаецца кожная пятая з іх. Напрыклад, аналіз зваротаў у абласных упраўленнях ДАІ паказаў, што асноўныя прычыны накіравання скаргаў — неналежнае выкананне сваіх абавязкаў супрацоўнікамі Дзяржаўтаінспекцыі, несвоечасовыя меры для папярэджвання канфліктнай сітуацыі, некваліфікаваныя дзеянні на першапачатковых стадыях адміністрацыйнага працэсу. Маюць месца скаргі грамадзян па пытанні чэргаў ў МРЭА ДАІ УУС Гомеля. Аднак цяпер прынята рашэнне аб стварэнні тут філіяла рэгістрацыйнага аддзела. Пераезд у новы будынак запланаваны на лістапад.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Здарэнні падчас канікулаў

Два вучні з вёскі Ілля Вілейскага раёна ўладкаваліся на «перакур» у… сенасховішчы, што належала аграфірме. У выніку прадпрыемства недалічылася 50 тон сена. Падраздзяленні МНС сумесна з работнікамі аграфірмы не далі агню знішчыць яшчэ 110 тон.

У Салігорскім раёне два першакласнікі Краснаслабадской сярэдняй школы залезлі ў зачынены дом аднаго з іх і расклалі вогнішча на… гарышчы. Бацькі хлопчыка ў прамым сэнсе слоў пазбавіліся даху над галавой — агонь знішчыў яго і частку перакрыцця. Самі вінаўнікаў з дома, што гарэў, выратавалі падраздзяленні МНС.

Мінскае абласное ўпраўленне МНС нагадвае бацькам: не пакідайце без нагляду дзяцей!

Сяргей РАСОЛЬКА.

Считать недействительными **страховые полисы** по обязательному страхованию «Зеленая карта» серии BY/12 № 1867069; 1867070; 1867071 ФС ООО «Белкоопстрах».

Гайненский сельский исполнительный комитет Логойского района (Продавец)

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже 1 (одного) земельного участка для индивидуального жилищного строительства:

Лот 1 — земельный участок № 3 в а/г Гайна, площадь участка — 0,1062 га, кадастровый номер 623280801601000182, начальная цена — 596500 белорусских рублей.

Целевое назначение земельных участков — строительство и обслуживание жилого дома.

Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется на р/счет № 3600619020025 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Логойск, МФО 153001518, УНП 600181697. Аукцион состоится **02.12.2008 г.** в 11.00 по адресу: Логойский район, д. Гайна, ул. Советская, 14. Заявление на участие и необходимые документы принимаются до **28.11.2008 г.** до 17.00 по адресу: Логойский район, д. Гайна, ул. Советская, д. 14.

Контактные телефоны: (8 01774) 58 2 36, 56 4 98.

ИЗВЕЩЕНИЕ

о проведении повторного открытого аукциона по продаже недвижимого имущественного комплекса – зданий и сооружений Чериковского плодоконсервного завода, расположенного по адресу: Могилевская обл., г. Чериков, ул. Ленинская, 1

Частное унитарное предприятие «Чериковский плодоконсервный завод» (Продавец) совместно с ЧУП «Белкооппроект» Белкоопсоюза (Организатор аукциона) проводят повторный открытый аукцион по продаже недвижимого имущественного комплекса – зданий и сооружений Чериковского плодоконсервного завода, расположенного по адресу: Могилевская обл., г. Чериков, ул. Ленинская, 1.

Начальная цена снижена на 50 % и составляет 611 531 394 белорусских рубля с НДС.

Размер задатка составляет 3 % от начальной цены, сумма задатка 18 345 942 белорусских рубля перечисляется на расчетный счет организатора аукциона – р/с 3012000003910 в ОАО «АСБ Беларусбанк», филиал 510, МФО 153001603, УНН 100105073 ОКПО 01790429 (в платежном поручении в графе «Назначение платежа» указывать: «Задаток согласно Условий проведения аукциона № 20-08 от 29.10.2008 г., без НДС»).

Аукцион состоится **13.11.2008 года** в 14.00 по адресу: г. Чериков, ул. Ленинская, 1, здание заводоуправления, 2-й этаж, актовый зал.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **12.11.2008 г.** включительно с 8.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, пр. Победителей, 17, 12-й этаж, каб. 1211.

Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

Плата за участие в аукционе составляет 257 290 белорусских рублей и перечисляется участниками на расчетный счет организатора аукциона (в платежном поручении в графе «Назначение платежа» указывать: «Плата за участие в аукционе согласно Условий проведения аукциона № 20-08 от 29.10.2008 г., в том числе НДС 18 %»).

Вознаграждение организатора аукциона составляет 1 % от продажной стоимости объекта и уплачивается победителем аукциона (помимо оплаты за объект) на расчетный счет организатора аукциона в течение 3-х рабочих дней с даты проведения аукциона.

Условия оплаты – разовый платеж.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней с даты проведения аукциона. Право собственности на объект переходит от ЧУП «Чериковский плодоконсервный завод» к победителю аукциона после полного расчета по договору купли-продажи объекта.

Объект продается без условий.

Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» № 160 от 27.08.2008 г.

Контактные телефоны: (8017) 226 78 84; 226 94 83; (0829)6812797.

ФОНД «МИНСКОБЛГОСИМУЩЕСТВО»

3 декабря 2008 года: г. Минск, ул. Чкалова, 5 проводит аукцион по продаже объектов республиканской собственности

На аукционные торги выставляются:

№	Время проведения	Наименование изолированного помещения	Характеристика здания (изолированного помещения)	Начальная цена продажи, рублей	Сумма задатка для участия в аукционе, рублей	Продавец недвижимого имущества
Лот 1	11.00	Изолированное помещение № 2 (столовая, инв. № 610/D-43566), расположенное в г. Борисове, ул. Полка Нормандия-Неман, 167	Отчуждается первый этаж в двухэтажном здании. Общая площадь изолированного помещения 1062,8 кв. м. Здание: стены – железобетонные панели, облицованные плиткой, перегородки гипсолитовые, перекрытия – железобетонные плиты, крыша совмещенная, полы – паркет, линолеум, плитка. Имеются инженерные коммуникации, грузовой лифт. Год постройки – 1980	127 815 433	10 000 000	Научно-производственое республиканское унитарное предприятие «Экран» (НПРУП «Экран»), г. Борисов, ул. Полка Нормандия-Неман, 167, тел. (0177) 70 62 71, 73 42 71
Лот 2	11.00	Изолированное помещение № 3 (столовая, инв. № 610/D-43567), расположенное в г. Борисове Минской области, ул. Полка Нормандия-Неман, 167	Отчуждается второй этаж в двухэтажном здании. Общая площадь изолированного помещения 1505,1 кв. м. Здание: стены – железобетонные панели, облицованные плиткой, перегородки гипсолитовые, перекрытия – железобетонные плиты, крыша совмещенная, полы – паркет, линолеум, плитка. Имеются инженерные коммуникации, грузовой лифт. Год постройки – 1980	181 007 724	15 000 000	Научно-производственое республиканское унитарное предприятие «Экран» (НПРУП «Экран»), г. Борисов, ул. Полка Нормандия-Неман, 167, тел. (0177) 70 62 71, 73 42 71
Лот 3	14.30	Изолированное помещение (в аптеке № 120, инв. № 631/D-6718), расположенное в дер. Куринец Вилейского района Минской области	Стены и перегородки бревенчатые, перекрытия деревянные, полы дощатые, крыша шиферная, отопление печное. Инженерные коммуникации отсутствуют. Год постройки – 1900. Общая площадь изолированного помещения 123,5 кв.м. Объект расположен на земельном участке площадью 0,25 га	3 673 300	300 000	Торгово-производственное республиканское унитарное предприятие «Минская Фармация» (РУП «Минская Фармация»), г. Минск, ул. Чкалова, 5, тел. (01771) 5 63 55, 5 89 41

Лот № 1 и № 2 расположены на земельном участке площадью 13, 2868 га.

Переход доли в праве на земельные участки победителю аукциона осуществляется в соответствии с пунктом 12 Указа Президента Республики Беларусь от 27 декабря 2007 г. № 667.

К участию в аукционных торгах допускаются: юридические лица, индивидуальные предприниматели, граждане Республики Беларусь и иностранные граждане, представившие в фонд «Минскоблгосимущество» в сроки, указанные в извещении, следующие документы:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), нотариально удостоверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации, также представитель должен иметь при себе паспорт или иной документ, удостоверяющий личность;

индивидуальным предпринимателем – нотариально удостоверенная копия свидетельства о государственной регистрации, представителем индивидуального предпринимателя дополнительно представляется нотариально удостоверенная доверенность;

иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, представителем иностранного юридического лица дополнительно представляется легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, а также паспорт или иной документ, удостоверяющий личность;

гражданином Республики Беларусь и иностранным гражданином – паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, представителем гражданина Республики Беларусь и иностранного гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

ПОБЕДИТЕЛЬ ОБЯЗАН: 1. **В течение 10 календарных дней** с момента подписания протокола о результатах аукциона подписать договор купли-продажи и возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона.

2. Произвести оплату объектов в течение 10 календарных дней с момента подписания договора купли-продажи разовым платежом.

Порядок проведении аукциона определен Положением о проведении аукционов по продаже объектов республиканской собственности и права на заключение договора аренды нежилого помещения, утвержденным Постановлением Министерства по управлению государственным имуществом и приватизации Республики Беларусь от 27 октября 2000 г. № 19.

Все **расчеты по сумме задатка** производятся путем перечисления их на расчетный счет фонда «Минскоблгосимущество» № 3642900000841 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код 795, ул. Мясникова, 32, УНН 100128686.

Заявки на участие в аукционе принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 312, тел.: 500 45 08, 224 57 09. Последний день подачи – 1 декабря 2008 г. до 13.00

ФОНД «МИНСКОБЛГОСИМУЩЕСТВО»

«2» декабря 2008 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5 проводит аукцион

по продаже недвижимого имущества, находящегося в собственности Минского района, и права заключения договоров аренды земельных участков, необходимых для их обслуживания

На аукционные торги выставляются:

	Лот № 1	Лот № 2	Лот № 3	
Предмет аукциона	**здание базовой школы (инв. № 600/С-103991) и право заключения договора аренды земельного участка, необходимого для его обслуживания**	**здание комплекса (РБУ) КПС (инв. № 600/С-105976) и право заключения договора аренды земельного участка, необходимого для его обслуживания**	**здание сенохранилища (конюшни) (инв. № 600/С-103403),**	**асфальтированная площадка (инв. № 600/С-106882)**
			и право заключения договора аренды земельного участка, необходимого для их обслуживания	
Местоположение недвижимого имущества	Минская область, Минский район, Михановичский с/с, д. Бордиловка	Минская область, Минский район, Щомыслицкий с/с, д. Новый Двор	Минская область, Минский район, Щомыслицкий с/с, д. Новый Двор	
Начальная цена предмета аукциона, рублей	279 696 153 (в том числе: недвижимое имущество – 144 119 053, право заключения договора аренды земельного участка – 135 577 100)	38 961 446 (в том числе: недвижимое имущество – 12 995 076, право заключения договора аренды земельного участка – 25 966 370)	136 743 083 (в том числе недвижимое имущество – 99 318 433, право заключения договора аренды земельного участка – 37 424 650)	
Сумма задатка для участия в аукционе, рублей	15 000 000	3 000 000	10 000 000	
Характеристика недвижимого имущества	Общая площадь 982,2 кв.м. Год постройки – 1951. Двухэтажное здание, фундамент ленточный бетонный, стены и перегородки кирпичные, крыша шиферная двухскатная, полы плиточные, дощатые. Имеются инженерные коммуникации: отопление, электроснабжение, водопровод и канализация	Общая площадь 31,4 кв.м. Год постройки – 1968. Одноэтажное, фундамент – фундаментные блоки, стены и перегородки кирпичные, перекрытия железобетонные, крыша рулонная мягкая, полы бетонные. Имеется электроснабжение. Инженерные коммуникации отсутствуют. Здание имеет обременение в виде договора аренды	Общая площадь 1050,8 кв.м. Год постройки – 1987. Одноэтажное здание, фундамент бетонный, стены бревенчатые, кирпичные столбы, перегородки и перекрытия деревянные, крыша шиферная, полы бетонные дощатые. Имеются инженерные коммуникации: канализация, водопровод, электроснабжение, вентиляция.	Общая площадь площадки 390 кв.м. Год постройки – 1993. Материал покрытия – асфальтобетон
Информация о земельном участке для обслуживания продаваемого недвижимого имущества	площадь 1,2625 га, срок аренды земельного участка – 30 лет	площадь 0,2418 га, срок аренды земельного участка – 30 лет. Земельный участок расположен в охранной зоне линий электропередачи напряжением свыше 1000 вольт	площадь 0,3485 га, срок аренды земельного участка – 30 лет. Земельный участок расположен в охранной зоне линий электропередачи напряжением свыше 1000 вольт	
Условия использования земельного участка	Для обслуживания здания базовой школы	Для обслуживания комплекса (РБУ) КПС	Для обслуживания здания сенохранилища (конюшни)	
Продавец недвижимого имущества	ГУ «Территориальный центр социального обслуживания населения Минского района», г. Минск, ул. Ф. Брикета, 10, тел. (8017) 5089078	Минское районное унитарное предприятие «Агрокомбинат «Ждановичи», г. Минск, ул. Вышелесского-1, тел. (8 017) 508 84 39		
Арендодатель земельного участка	Минский районный исполнительный комитет			

К участию в аукционных торгах допускаются: юридические лица, индивидуальные предприниматели, граждане Республики Беларусь и иностранные граждане, представившие в фонд «Минскоблгосимущество» в сроки, указанные в извещении, следующие документы:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), нотариально удостоверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации, также представитель должен иметь при себе паспорт или иной документ, удостоверяющий личность;

индивидуальным предпринимателем – нотариально удостоверенная копия свидетельства о государственной регистрации, представителем индивидуального предпринимателя дополнительно представляется нотариально удостоверенная доверенность;

иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, представителем иностранного юридического лица дополнительно представляется легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, а также паспорт или иной документ, удостоверяющий личность;

гражданином Республики Беларусь и иностранным гражданином – паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, представителем гражданина Республики Беларусь и иностранного гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

1. Минский райисполком принимает решение о предоставлении победителю аукциона земельных участков в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

2. Победитель аукциона в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона возмещает расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, а также расходы, связанные с формированием земельного участка, вносит плату, взимаемую за право заключения договора аренды. После внесения победителем аукциона названных платежей продавец имущества заключает договор купли-продажи недвижимого имущества, а Арендодатель земельного участка – договор аренды земельного участка.

3. Оплата за объекты недвижимости должна быть произведена победителем аукциона не позднее 20 рабочих дней с даты проведения аукциона.

Порядок проведения аукциона определен в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

Фонд «Минскоблгосимущество» (организатор аукциона) имеет право снять предмет аукциона в любой момент до даты проведения аукциона.

Все **расчеты по сумме задатка** производятся путем перечисления их на расчетный счет фонда «Минскоблгосимущество» № 3642000000028 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код 795, ул. Мясникова, 32, УНН 100128686.

Заявки на участие в аукционе принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 312, тел. 224 57 09. Последний день подачи заявок 1 декабря 2008 г. до 13.00.

Палеміка

А ці патрэбна нашаму грамадству такое цэнтралізаванае тэсціраванне?

Аўтары гэтага артыкула яшчэ нядаўна займалі дыяметральна процілеглыя пазіцыі ў дачыненні да цэнтралізаванага тэсціравання (далей — ЦТ) як формы ўступнага экзамену ў ВНУ (гл. палеміку ў газеце «Звязда» ад 10 і 14 мая 2008 г.). Аднак вопыт уступнай кампаніі гэтага года і яе водгласы ў грамадскай думцы зблізілі нашы пазіцыі: захаванне ЦТ у яго сённяшняй форме здольнае нанесці непапраўны ўрон будучаму нашай краіны.

1. Асноўнай матывацыяй пры ўвядзенні ЦТ, як формы ўступнага экзамену, было імкненне дзяржавы выкараніць карупцыю. У нячыстых на руку дзялкоў адабралі галоўны інструмент — магчымасць спекуляваць варыянтамі ўступных экзаменаў. А рабілі яны гэта ў завуаліраванай форме: пад выглядам «рэпетытарства» непасрэдна перад экзаменамі выдавалі сваім падапечным «вучням» зацверджаныя прыёмнымі камісіямі варыянты, і закараналыя троечнікі завучвалі затым іх рашэнні на памяць, атрымліваючы на ўступным экзамене найвышэйшы бал. У выкладчыцкім асяродку такое рэпетытарства называюць «падрыхтоўкай па вядомых варыянтах». Пры гэтым для адсячэння шматлікіх канкурэнтаў, здольных здаць на самы высокі бал без пратэкцыі, у варыянты ўключаліся задачы, рашэць якія маглі толькі адзінкі.

Здавалася, з увядзеннем ЦТ грамадства цалкам і беспаваротна паверыла ў раўнапраўе ўсіх, хто паступае ў ВНУ. Аднак у апошнія гады сталі ўпарта множыцца чуткі аб уцечцы закрытай інфармацыі аб ЦТ: то там, то тут, напярэдадні чарговага тэсціравання, фіксаваліся выпадкі наяўнасці ў некаторых абітурыентаў шаблонаў правільных адказаў і варыянтаў заданняў; з'явіліся рэпетытары, якія гарантавалі стопрацэнтны вынік на ЦТ і аб'яўлялі сябе экспертамі Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў (магчыма, гэта самазванцы, але...). Сёлета «Комсомольская правда» адразу пасля ЦТ па матэматыцы паведамляла, што варыянты ЦТ былі прадастаўлены газеце адным з чытачоў за дзень да тэсціравання і апублікавала некаторыя задачы 25 чэрвеня. Некаторыя абітурыенты, якія выйшлі на сайт газеты, пацвердзілі, што ў іх таксама былі варыянты. Зразумелага адказу з боку адміністрацыі Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў (далей — РІКВ) не паступіла.

Так, усё гэта можна было б назваць выдумкамі няўдачнікаў. Але вельмі ўжо многа тут супадзенняў з тым, што тварылася на ўступных экзаменах у мінулыя гады: тая ж устойлівая пагалоска аб падрыхтоўцы «па вядомых варыянтах»; наяўнасць у варыянтах «задач-пастак», якія, хутчэй, апелююць да выпадковай «здагадкі», чым да канкрэтнага матэматычнага навыку ці ўмення. Выклікаюць неўразуменне і вынікі апошняга ЦТ па матэматыцы, калі, з аднаго боку, больш як 50 працэнтаў тэстуемых умудрыліся набраць менш як 20 балаў, а з другога — надзвычай высокая колькасць (у параўнанні з мінулымі гадамі) тых, хто атрымаў стопрацэнтны вынік. Пры гэтым вядомыя дакладныя факты, калі такія «90—100-бальныя вундэркінды» мінулых гадоў у далейшым выключаліся з ВНУ за непаспяховасць па матэматыцы.

Што гэта? Непрафесіяналізм складальнікаў тэстаў або злоўжыванне тых, хто мае да іх доступ? Або гэта перабольшванні, якія заўсёды спадарожнічаюць добрым пачынанням? У любым выпадку грамадства зможа (і абавязана) атрымаць адказы на гэтыя пытанні, толькі калі ЦТ будзе адпавядаць агульнапрынятым крытэрыям галоснасці і прафесіяналізму. А вось якраз з гэтымі двума складнікамі ў сёлетнім ЦТ далёка не ўсё ў парадку.

2. Апошнім часам РІКВ, які адказвае за правядзенне ЦТ, ператварыўся ў адну з самых закрытых і заканспіраваных устаноў.

Па-першае, тайнай за сямю пячацямі застаюцца правілы (а ці ёсць гэтыя правілы ўвогуле?) фарміравання камандаў экспертаў, якія адказваюць за складанне варыянтаў. Мы не заклікаем абнародаваць іх імёны. Аднак у нас няма сумненняў, што ратацыю экспертаў трэба праводзіць рэгулярна і паслядоўна хоць бы адзін раз у два гады.

Па-другое, адсутнічае аб'ектыўная і незалежная экспертыза варыянтаў заданняў. Мы не заклікаем абнародаваць варыянты маючага адбыцца тэсціравання — дастаткова правесці незалежную экспертызу ўжо прайшоўшых іспытаў, каб выявіць і пераадолець якасныя хібы ў будучым. Асабліва гэта патрэбна варыянтам па матэматыцы апошняга ЦТ, якія прывялі да супярэчлівых і спрэчных вынікаў і спарадзілі шматлікія прэтэнзіі да іх якасці.

Па-трэцяе, абсалютна туманнымі для абітурыентаў застаюцца крытэрыі ацэнкі вынікаў тэсціравання, якія, як паказвае вопыт, рэзка мяняюцца з года ў год.

Такім чынам, РІКВу фактычна аддадзена манапольнае права вызначаць адзін з найважнейшых кампанентаў нашага грамадскага жыцця — фарміраванне студэнцкага корпуса. І мяркуючы па ўсім, зроблена гэта было дачасна.

3. Тэматыка матэрыялу, які ахопліваецца тэстамі, звужаецца з года ў год: задачы, звязаныя з вектарамі і камбінаторыкай, даўно ўжо не ўключаюцца ў тэставыя заданні (некаторыя настаўнікі сталі фармальна ставіцца да гэтых тэмаў, і іх можна зразумець: навошта займацца тым, што не спатрэбіцца); нядаўна былі выключаны прыклады з параметрамі; на чарзе, магчыма, вытворная і модулі.

Паралельна са звужэннем тэматыкі ідзе адкрытая прымітывізацыя саміх заданняў, якая была асабліва прыкметная сёлета. Многія заданні з нацяжкай можна назваць «задачамі» — хутчэй, гэта «пытанні», разлічаныя на чалавека, які закончыў школу шмат дзесяцігоддзяў таму і з таго часу ні разу не асвяжыў у сваёй памяці элементарных ведаў. Разумеем, што мноства такіх «задач» прадыктавана зніжэннем з году ў год узроўню падрыхтоўкі па матэматыцы ў сярэдняй школе. І таму спрашчэнне тэстаў — вымушаная мера. Аднак не варта даводзіць гэты працэс да абсурду. З аднаго боку, для абітурыентаў, якія не адрозніваюць «сінус ад косінуса» або бянтэжацца пры пытанні аб «колькасці вуглоў у трохвугольніку», самыя прымітыўныя заданні ўсё роўна застануцца непасільнымі, як іх ні спрашчай. З іншага боку, адкрытая арыентацыя на ніжэйшы ўзровень матэматычнай падрыхтоўкі прэтэндэнтаў на вышэйшую адукацыю адмоўна адбіваецца на якасным складзе студэнцтва: дайшло ўжо да таго, што сёлета студэнтамі некаторых ВНУ сталі абітурыенты, якія набралі 8—9 балаў па матэматыцы або фізіцы! Выходзячы з узроўню заданняў гэтага года, можна ўпэўнена канстатаваць, што набраць 8 балаў абавязаны быў кожны, хто правучыўся ў школе не больш як 5 гадоў. Акрамя таго, гэтыя 8 балаў можна было набраць элементарным угадваннем адказаў.

У сувязі з гэтым узнікае рытарычнае пытанне: навошта вучыцца матэматыцы ўсе 11 гадоў, калі для паступлення ў ВНУ дастаткова рашыць пару-тройку «задач» (або проста адгадаць іх адказы) у рамках патрабаванняў пяці класаў?

Вымушае чакаць лепшага і якасць заданняў павышанай складанасці. Яны адлюстроўваюць прыхільнасці адной і той жа групы экспертаў і няздольныя выдзеліць з агульнай хвалі абітурыентаў здольных да матэматыкі школьнікаў. «Назойлівасць» задач падобнага тыпу яшчэ раз наводзіць на думку аб наспелай ратацыі ў «клане» экспертаў.

Ну і зусім ужо адыёзным было летняе рашэнне Міністэрства адукацыі ў самы разгар уступнай кампаніі змяніць «правілы гульні ў час самой гульні» — апусціць загадзя аб'яўлены прахадны парог для атрымання сертыфікатаў па матэматыцы з 20 балаў да 8. Дзеля справядлівасці адзначым, што гэта мера была вымушанай, інакш нашы ВНУ засталіся б без студэнтаў. Але выклікана яна была, на наш погляд, непрафесіяналізмам арганізатараў ЦТ.

Такім чынам, хоць адзін з аўтараў артыкула паранейшаму прытрымліваецца пункту гледжання аб непрымальнасці ЦТ як формы ўступнага экзамену ў ВНУ, абодва аўтары адзіныя ў адным: цэнтралізаванае тэсціраванне ў яго цяперашнім выглядзе наносіць непапраўную шкоду беларускай адукацыі. Пераламаць гэту сітуацыю можна будзе толькі тады, калі адміністрацыя РІКВ пазбавіцца манапольнага права фарміраваць студэнцкі корпус краіны, пачне прыслухоўвацца да думкі грамадскасці і будзе своечасова спыняць негатыўныя тэндэнцыі.

Алег МЕЛЬНІКАЎ,
доктар педагагічных навук, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, прафесар кафедры ўраўненняў матэматычнай фізікі БДУ,
Аркадзь ЧАРНЯК,
доктар фізіка-матэматычных навук, лаўрэат прэміі Акадэміі навук БССР, прафесар кафедры матэматыкі БДПУ імя М. Танка.

Працяг палемікі — адказ дырэктара Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Мікалая ФЯСЬКОВА — чытайце ў наступным нумары.

ЧУЖАЯ СПАДЧЫНА — ПРАЗ ГОЛАС КРЫВІ

Постаці

1 лістапада пісьменніку Вячаславу Адамчыку споўнілася б 75 гадоў. І споўнілася — без умоўнасцяў. Таму што ў творцаў, якія працуюць са словам, ёсць перавага над іншымі — яны звяртаюцца да людзей, разважаюць, цікавяцца і могуць параіць нешта нават праз гады пасля сыходу ў іншы свет. Слова, якое людзям было дадзена спачатку, будзе з імі да сканчэння свету. І доказ гэтаму — лёсы многіх пісьменнікаў, пра якіх мы ведаем праз стагоддзі дзякуючы напісанаму імі. У Вячаслава Адамчыка быў лёс пісьменніка XX стагоддзя: спаўна глытнуў усіх выпрабаванняў, якія паспыталі яго землякі-вяскоўцы з Заходняй Беларусі, пражыў вайну, голад і нястачы, цяжкую працу. Але вясковы хлопец імкнуўся да ведаў, адчуваў патрэбу ў адукацыі, якая адкрыла яму іншы свет, дзе была патрэба ў жывым слове. У яго — патрэба сказаць. Пра тое, што бачыў, пражыў, адчуў і зразумеў пра людзей. За што былі ўзнагароды ад іх — Дзяржаўная літаратурная прэмія імя Якуба Коласа, напрыклад. Менавіта ўвага да чалавека, да яго характару, да вытокаў розных учынкаў і сувязі пакаленняў вылілася ў пісьменніка ў цыкл з чатырох раманаў: «Чужая Бацькаўшчына», «Год нулявы», «І скажа той, хто нарадзіцца», «Голас крыві брата твайго».

Але самае дзіўнае ў творчасці Вячаслава Адамчыка — яна працягваецца сёння. Жыве ў яго дзённіках, якія дасталіся ў спадчыну яго сям'і і дзякуючы ёй з'яўляюцца ў друку. Жыве — таму што яго запісы, зробленыя некалькі гадоў таму, выклікаюць жывую рэакцыю, спрэчкі і нават абурэнне: што ён сабе дазваляў у дзённіку?.. Але ці не для таго дзённікі пішуцца, каб даць волю сваім думкам, не палохаючыся таго, што іх хто-небудзь можа пачуць? І чаго кагосьці бянтэжаць чужыя думкі, калі штодня мы параджаем безліч сваіх уласных, якіх часам варта спалохацца? А чужыя дзённікі… Магчымасць праз словы пісьменніка, якія не прагучалі ўслых, звярнуцца да таго, што ён хацеў сказаць у творах, а мы яшчэ не зразумелі. Доказ таго, што час можна павярнуць назад, вярнуўшыся ў тыя дні, калі пісьменнік углядаўся ў твар жыцця. За год да яго смерці.

Субота, 5 лютага 2000 года.

8.50 *Адліга. Слота. Белая паласатая марля снегу на карычневых мокрых дахах.*

З начных запісаў:

Успаміны — гэта пустата, куды мы часта правальваемся.

Балаголы, фурманы, возчыкі, аратыя любілі пагаварыць да сваіх коней, найболей пажурыць іх. А я чуў, як нябожчык Дзяргай журыў і дакараў павучка, што жыў у яго ванным пакоі...

15.10 *Ясна-блакітнае, у зеніце сіняватае неба па-вясноваму чыстае, толькі на небасхіле за карычневымі і ўжо сухімі дахамі дамоў хаваюцца бела-кудзеркаватыя хмаркі.*

Варона грэе сівае волле на нізкім ужо сонцы і каркае, прысядаючы і растапырваючы чорны хвост.

Панядзелак, 7 лютага 2000 года.

6.30 *Ажно два разы гатаваў чай: у 3 раніцы і ў 6. Але, прачнуўшыся ў 2, так і не заснуў болей. Спаць не давалі то ўспаміны, то крыўда. Хоць у маіх гадах трэба было б прызвычаіцца да ўсяго.*

Чыталася розная нікчэмнасць агідных кожынавых пра... ВЧК-ОГПУ-НКВД..., дзе сядзелі жывадзёры ягоды, яжовыя, агранавы, бокія, берыі, гноячы і забіваючы людзей у сутарэннях Лубянкі. Яны, людажэрцы, ганарыліся і выхваліліся тым, што стваралі заградатарады, канцлагеры і душагубкі...

Адліга. Малочнае святло ліхтароў адбіваецца ў вулічных лужынах. Далёкім громам пагруквае падземка. Залаціста-калючыя лямпачкі ў акварыумнай глыбіні вокнаў. Зімовая сіняватая раніца. З натужным вуркатам адзінокага фургона, што прывёз свежы хлеб. Уяўляю, як пахне ён, папраўдзе дар божы.

І бачу карычневыя боханы з крыжыкам і абавязковымі шарэнгамі ямачак на скарынцы. Яны, вялікія авальныя боханы, астываюць на стале і дылёвай тоўстай лаве, а ў маёй руцэ акраец апалушкі — першага, спечанага для пробы (ці ўдаўся хлеб), пляскатага, таксама ў ямачках, баханка.

І тут жа ўваскрэслі доўгія задушлівыя калейкі (чэргі) каля мясцічкавага магазіна. Крык, гоман, сварба. 1946 ці 1947 год пасля адмены картачкаў, калі і вёска прыйшла ў мястэчка купляць сыраваты і цяслявы хлеб.

16.20 *У лужыне сярод шарабруднага снегу зноў загарэлася і пераліваецца залатам калючая зорка велічынёю з Сірыус.*

Навалення чамусьці бачыцца. Тая, даўнейшая, аднапавярховая і драўляная, Навалення маіх школьных гадоў з роснымі хвойкамі, гарбатымі на пясчаных вуліцах карэннямі і з тымі людзьмі, што хадзілі па гэтых вуліцах. Не ўсе мне мілыя былі вуліцы, і хаты, і людзі ў іх. Шмат было чужых, як мы казалі, савецкіх, наезджых, цывільных і вайсковых, з чужою рускаю моваю. І нават убранствам. І прозвішчамі — забеліны, вахрушавы, юдзіны...

Не ўсё блізкае і прымальнае было і ў роднай Варакомшчыне. Забітасць, неадукаванасць... Чужы сярод сваіх.

Але ўсё паволі сплыло, як вада ў рэчцы, а я стаю над стромаю амаль што адзінокі, і шуршыць пяском і адколваецца бераг.

Панядзелак, 10 красавіка 2000 года.

8.00 *...Учора перажыта адчуванне блізкае смерці. Сядзеў на канапе ў Наталінай кватэры і гатовы быў да ўсяго.*

А прыйшоўшы дадому, не мог стаяць нават на нагах — патрэбныя былі намаганні.

За гэтую зіму ўжо трэці выпадак, калі мяне адужвае такі боль і такая слабасць.

Ноччу гартаў «Фрагменты» Геракліта, спыняючыся на формуле: «Бяссмертныя смяротныя, смяротныя бяссмертныя, (адныя) жывуць за кошт смерці іншых, за кошт жыцця іншых паміраюць».

12.30 *Не пішу, не чытаю, сплю ад слабасці.*

Зноў адгортваю «Фрагменты» Геракліта. «Хвароба робіць прыемным і дабрадзейным здароўе, голад — наежнасцю (сытнасцю), стому — адпачынкам». І ўспамінаю свае маладыя гады, шпаркую і лёгкую хаду і... сваё універсітэцкае галаданне...

18.10 *Нарэшце праз ўвесь двор праляцела даўночаканая валасянка (пліска).*

З усходу дыхае сіверам. Учора ён нават браў за вушы.

Чацвер, 13 красавіка 2000 года.

9.00 *Пачаўся яшчэ ўчора вечарам. Мокра і нібы тлуставата паблісквaюць паласатыя дахі. Голыя чорныя ліпы і клёны падымаюць над імі свае дзяркатыя вяршкі. +6° С. Галодная вясна. І мне прыгадваецца Вялікдзень 42-га. Праваслаўны, што выпаў на 5-га красавіка. На такое самае шарае прадвесне.*

Мы, пагарэльцы, жылі ў Навалені, у белым доме, збудаваным немцамі яшчэ ў першую сусветную вайну, недалёка ад дэпо вузкай калейкі. Цераз шашу і насып чыгункі стаяла шарая, накрытая пачарнелаю гонтаю хата Кардаша Сенькі, местачковага сальніка. Яго сын Барыс, мой равеснік, паклікаў мяне да сябе, каб пахваліцца багатым велікодным сталом. Мне запомніўся аранжавы абажур у залацістых фрэнзлях і доўгі, мусіць, стыкаваны з двух, стол, пакрыты белымі абрусамі. А калі Барыс адгарнуў іх, мне ўбачыўся зайздросны цуд: жоўтыя, прыўзнятыя, як царскія кароны, пірагі, на талерках нарэзаныя шынкі і каўбасы, ружова-малінавыя ў графінах і шкляных збанках, напіткі, скрылі белых сыроў...

Барыс неяк па-зладзейску выхапіў са стала дзве лусты пухкага пірага — для сябе і меншай сястры — і тут жа загарнуў абрус.

Мяне, вядома, не пачаставаў. Крыўда мая, дзевяцігадовага галоднага падлетка, была да роспачы вялікая, бо запомнілася на ўсё жыццё.

Панядзелак, 17 красавіка 2000 года.

15.30 *Перачытваю «Ваенны дзённік» Ф.Галдэра. Успамінаю 41 год, маладое лета, уцёкі рускіх салдат у абмотках. Кінутыя шынялі, газавыя сумкі, вінтоўкі, гранаты... І расстраляную запальнымі снарадамі, спапялёную Варакомшчыну... Мы з мацераю начавалі ў яме. Бацька трапіў у палон.*

Панядзелак, 24 красавіка 2000 года.

8.00 *Учора на ліпе, што пад маім акном, толькі на вяршку зазелянелі банцікі, а сёння яна ўся ў гэтым харастве. Як імкліва напералад ідзе жыццё. І як мы, сталыя людзі, не паспяваем за ім, астаючыся ў нейкім сваім, ужо закамянелым часе.*

Забліскала лісце і на жаўтлява-зялёным сохарані.

10.30 *На ліпе ніжнія банцікі ўжо разгарнуліся ў кволае лісце.*

Збіраюся на дачу. Пакую ў сумку цвікі, малаткі і... «Мацюка», пачатае апавяданне з новаю ўжо назваю — «Бронежылетка №36».

На дачы мне ніколі не пісалася, але хоць бы зачапіцца за два-тры сказы.

13.30 *Пенкны златоясны дзень, як сказалі б славакі. Ліпы цераз адну выпусцілі вострае кволае лісце.*

Напэўна, і ў нашай мове, як у славенскай (славацкай), мусяць быць такія словы: златагрывы, златаясны, залатапалосы (поле, ячмень, вянец), златакрылы (анёл), золатапакута чаша (келіх), золатамедны, златапёры, златараснае ўбранства (шаты), златарогі, златаструнны (арфа), златавалосы.

13.40 *Першы пошум жаўтлява-зялёнага са срэбным водбліскам маладога лісця (на сохарані і на бярэзінах).*

12 лістапада 2000 года.

22.05 *...Талстой, каб не дбаць пра сябе, бездапаможна звяртаўся да Бога. Аднак прыватнае, сваё перасільвала і парамагала.*

Мне чамусьці не хочацца чытаць тых, каму за восемдзесят. Яны перажылі не толькі іншых, але і самі сябе. Яны пераступілі магілы, каб не ўпасці ў існаю чорную прорву. Але існія кнігі — гэта ўжо тлен. Таму я чытаю існіх равеснікаў, што адышлі маладымі, — там жыццё. А ў творах пражыўшых і даўгавечных — ужо тлен.

ПРАДАВАЎ БІЛЕТЫ З-ПАД КРЫСА...

Праваахоўнікі злавілі 24-гадовага беларуса ў той момант, калі ён з-пад крыса спрабаваў рэалізаваць білеты на футбольны матч паміж клубамі «БАТЭ» і «Зеніт». 100 білетаў коштам па 50 тысяч рублёў ён прапаноўваў набыць за 150 тысяч рублёў за адзін і разлічваў атрымаць даход у 10 мільёнаў рублёў.

Ігар ГРЫШЫН.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Минский городской территориальный фонд государственного имущества сообщает о проведении открытого аукциона по продаже находящихся в коммунальной собственности города Минска акций открытых акционерных обществ. Аукцион состоится **17 декабря 2008 г.** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Продавец – Минский городской территориальный фонд государственного имущества, г. Минск, пр-т Независимости, 8.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами принимаются с 9.00 до 17.00 с **3 по 28 ноября 2008 г.** включительно по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, 8, каб. 227, т. 200 20 89.

Для участия в аукционе необходимо предоставить:

заявление на участие в аукционе по установленной форме;

юридическим лицам – резидентам Республики Беларусь – нотариально заверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации, представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, нотариально заверенную копию выданной Министерством финансов Республики Беларусь лицензии на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности на рынке ценных бумаг (профессиональным участникам рынка ценных бумаг);

представителям физических лиц – резидентов Республики Беларусь – нотариально заверенную доверенность;

юридическим лицам – нерезидентам Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное равнозначное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения;

представителям юридических и физических лиц – нерезидентов Республики Беларусь – легализованную в установленном порядке доверенность;

документ, подтверждающий согласие антимонопольного органа на совершение сделки, в случаях, установленных законодательством Республики Беларусь.

При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц представляют копию паспорта или иного документа, удостоверяющего личность, и предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, для заверения его копии лицом, принимающим документы.

Участником аукциона перечисляется задаток в белорусских рублях в размере 10 процентов от общей начальной цены заявленных лотов на р/с 3642000000015 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код 795, УНП 100048181 Минского городского территориального фонда государственного имущества не позднее 28 ноября 2008 года. Заверенная банком копия платежного поручения, подтверждающая внесение задатка, предоставляется Продавцу в течение двух рабочих дней со дня перечисления задатка.

Выигравшим торги на аукционе по каждому предложенному лоту признается участник, предложивший наиболее высокую цену; внесенный им задаток учитывается при окончательных расчетах за приобретенные им акции.

Участник, ставший победителем аукционных торгов по лоту, обязан произвести оплату стоимости акций в белорусских рублях, возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, в размере 1% от начальной цены пакета акций в течение трех банковских дней со дня проведения аукциона. Кроме того, участники, ставшие победителями аукционных торгов по лотам 1 и 2, возмещают расходы на проведение оценки рыночной стоимости акций в течение трех рабочих дней со дня подписания протокола о результатах торгов в размере: по лоту 1 – 13 073 280 рублей, по лоту 2 – 13 073 280 рублей.

Договор купли-продажи акций заключается в течение 10 календарных дней со дня проведения аукциона с участником, выигравшим торги.

До подписания договора купли-продажи акций победитель, в случаях предусмотренных законодательством, обязан предъявить выданную налоговыми органами справку о представлении декларации об источниках денежных средств, расходуемых на совершение сделки по приобретению акций.

Получить более подробную информацию об открытых акционерных обществах, акции которых предлагаются для продажи, ознакомиться с их проспектами эмиссий и годовыми балансами по состоянию на 1 января 2008 г. можно по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, 8, каб 227.

Контактный телефон:

Минский городской территориальный фонд государственного имущества (017) 200 20 89

Номер лота	Наименование открытого акционерного общества (ОАО), местонахождение	Размер уставного фонда, штук акций	Номинальная стоимость акции, рублей	Доля коммунальной собственности города Минска в уставном фонде открытого акционерного общества		Предлагается для продажи		Начальная цена акции, рублей	Начальная цена пакета акций, рублей	Размер задатка, рублей	Наличие 10 % и более акций уставного фонда у юридических и физических лиц
				%	количество акций, штук	в % к уставному фонду	количество акций, штук				
1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12
1	Искра – М, ул. Инженерная, 1а	116 357	350	28,57	33 242	28,57	33 242	12 054	400 700 000*	40 070 000	—
2	Торгразвитие, ул. Вильямса, 45	97 016	400	17,72	17 187	17,72	17 187	26 555	456 400 000*	45 640 000	—
3	Универсам Рига, ул. Сурганова, 50	151 200	43 358	1,58	2 383	1,58	2 383	79 881	190 356 423	19 035 640	юридическое лицо — 85,8 %
4	Универсам Фрунзенский, пр-кт Пушкина, 37	87 043	49 900	0,011	10	0,011	10	58 396	583 960	58 400	юридическое лицо — 55,5 %

* — рыночная стоимость

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

по продаже в частную собственность земельных участков

4 декабря 2008 г. в 11.00 в административном здании Обуховского сельского исполнительного комитета (деревня Обухово, ул. Центральная, 4, Гродненский район) состоится аукцион по продаже в частную собственность земельных участков.

№ лота	Кадастровый номер и адрес земельного участка	Площадь земельного участка, га	Целевое назначение земельного участка	Начальная цена предмета аукциона, белорусских рублей	Подлежащие возмещению расходы, связанные с проведением аукциона, подготовкой документации, необходимой для его проведения, белорусских рублей	Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории
1	422086003601000062, деревня Курпики, Обуховский сельсовет, Гродненский район	0,1368	для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	455 000	1 100 000	вблизи участка проходят сети газоснабжения и водоснабжения
2	422086006601000053, деревня Новосёлки, Обуховский сельсовет, Гродненский район	0,1288	для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	275 000	1 100 000	земельный участок прилегает к дороге с грунтовым покрытием

Для участия в аукционе гражданин Республики Беларусь (лично либо через своего представителя) со дня опубликования настоящего извещения и до 17.00 1 декабря 2008 г. представляет в комиссию по организации и проведению аукциона по продаже в частную собственность земельных участков по адресу: 231766, Гродненский район, д. Обухово, ул. Центральная, 4, документы:

заявление на участие в аукционе с указанием кадастрового номера и адреса земельного участка, который они желают приобрести в частную собственность по результатам аукциона;

заверенную копию платежного поручения о внесении задатка в размере 10 % от начальной цены предмета аукциона на расчетный счет в Главном управлении МФ по Гродненской области № 3600514060119 в филиале № 400 ОУ АСБ «Беларусбанк» г. Гродно, код 752, УНН 500027360, назначение платежа 04002;

копию документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

представитель гражданина — нотариально удостоверенную доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане и представители граждан, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Осмотр земельного участка осуществляется претендентом на участие в аукционе в сопровождении члена комиссии по организации и проведению аукциона по продаже земельных участков в частную собственность в любое согласованное ими время в течение установленного срока приема заявлений.

Контактные телефоны: (80152) 968 573, 968 787, 974 071, 740 414.

Аукцион проводится при наличии не менее 2 участников. Аукцион проводится в порядке, определенном Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462. Шаг аукциона – 10 % от предыдущей цены, называемой аукционистом. Победитель аукциона в течение 10 рабочих дней со дня принятия исполкомом решения о предоставлении победителю земельного участка вносит плату за предмет аукциона и возмещает расходы, связанные с проведением аукциона, подготовкой документации, необходимой для его проведения. Победитель аукциона в двухмесячный срок после принятия исполкомом решения о предоставлении победителю земельного участка обязан осуществить государственную регистрацию права частной собственности на земельный участок.

Извещение об открытом аукционе по продаже права аренды земельных участков в г. Гродно

№ лота	наименование объекта	местонахождение объекта	площадь земельного участка (га)	кадастровый номер	начальная цена продажи (тыс. руб.)	сумма задатка (тыс. руб.)	форма проводимого аукциона	условие продажи объекта	срок аренды участка
1.	Право аренды земельного участка	Бульвар Ленинского Комсомола	0,2975	440100000002005266	114 050	11 400	Аукцион с условием	Строительство в течение 2-х лет административного здания с блоком обслуживания на первом этаже (в составе блока обслуживания предусмотреть парикмахерскую, расчетный центр и др., благоустройство прилегающей территории до сопредельных участков, включая подъезды и гостевые автостоянки, площадью 0,15 га)	51 год
2.	Право аренды земельного участка	Перекресток ул. Пушкина и Бульвара Ленинского Комсомола	0,9966	440100000002005260	382 180	38 200	Аукцион с условием	Строительство в течение 2-х лет здания делового центра общей площадью до 7000 м.кв. с конференц-залами и кафе на 50 посадочных мест (высота здания не выше 4-х этажей, благоустройство прилегающей территории до сопредельных участков, включая подъезды и гостевые автостоянки, площадью 0,6 га)	51 год
3.	Право аренды земельного участка	пл. Декабристов	0,8001	440100000002005339	420 000	42 000	Аукцион с условием	Строительство в течение 2-х лет торгово-развлекательного центра (высота здания не выше 3-х этажей, благоустройство прилегающей к участку территории с организацией автостоянок на 150-200 машиномест)	51 год

Организатор аукциона: ГП «Гродненский центр недвижимости».

При оформлении заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет:

1) Копии платежных поручений о внесении задатка, 4-х базовых величин за подачу заявления на расчетный счет 3012000006896 в фил. 426 АСБ «Беларусбанк», код 199, УНП 590727594 получатель – ГП «Гродненский центр недвижимости», с отметкой банка-отправителя об их исполнении.

Юридическое лицо: доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда данное юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов.

Физическое лицо: паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

2) Платеж за объект осуществляется единовременно по безналичному расчету в расчетных билетах Национального банка РБ или в иностранной валюте по курсу НБ РБ на день оплаты в течение 10-ти рабочих дней со дня принятия решения горисполкома о предоставлении земельного участка.

3) В случае победы на аукционе заявитель обязан оплатить вознаграждение организаторам аукциона в размере 4 % от начальной цены продажи и 5 % от суммы превышения продажной цены над начальной.

4) Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с объектами.

5) Аукционные торги состоятся при наличии не менее 2-х участников по выставленным лотам.

Аукцион состоится 2 декабря 2008 года в 12.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2. Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2, каб. № 57, в рабочие дни с 8.30 до 17.30. **Заявления принимаются с 3 ноября по 26 ноября 2008 г.**

Телефон для справок в Гродно: (0152) 720546. Адрес сайта: www.gorod.grodno.by

Извещение об открытом аукционе по продаже земельных участков в собственность в г. Гродно

№ лота	1	2	3	4	5	6	7	8
наименование объекта	Земельный участок У-58К	Земельный участок У-59К	Земельный участок У-60К	Земельный участок У-61К	Земельный участок У-62К	Земельный участок У-63К	Земельный участок У-64К	Земельный участок У-65К
местонахождение объекта	м-н «Южный-4»	м-н «Южный-4»	м-н «Южный-4»	м-н «Южный-4»	м-н «Южный-4»	м-н «Южный-4»	м-н «Южный-4»	м-н «Южный-4»
площадь земельного участка (га)	0,1131	0,1132	0,1080	0,1138	0,1148	0,1128	0,1215	0,1221
кадастровый номер	440100000003004047	440100000003004048	4401000000030049	4401000000030050	440100000003004052	440100000002005282	440100000003004053	440100000003004054
начальная цена продажи	10 000 000 руб.							
сумма задатка	1 000 000 руб.							
Сумма возмещения расходов, связанная с проведением аукциона	2 544 450 руб.							

№ лота	9	10	11	12	13	14	15
наименование объекта	Земельный участок У-66К	Земельный участок У-67К	Земельный участок У-68К	Земельный участок У-80К	Земельный участок У-83К	Земельный участок	Земельный участок
местонахождение объекта	м-н «Южный-4»	м-н «Южный-4»	м-н «Южный-4»	м-н «Южный-4»	м-н «Южный-4»	ул. Весенняя, 31	ул. Весенняя, 33
площадь земельного участка (га)	0,1246	0,1217	0,1217	0,1143	0,1084	0,0999	0,0880
кадастровый номер	440100000001004051	440100000003004056	440100000003004057	440100000003004063	440100000003004066	440100000002005341	440100000002005338
начальная цена продажи	10 000 000 руб.					15 000 000 руб.	13 000 000 руб.
сумма задатка	1 000 000 руб.					1 500 000 руб.	1 300 000 руб.
Сумма возмещения расходов, связанная с проведением аукциона	2 544 450 руб.					3 800 000 руб.	3 800 000 руб.

Аукцион проводится с условием: строительство и обслуживание жилого дома в течение 3-х лет с момента принятия решения горисполкома о передаче участка в частную собственность.

Земельный участок победителю аукциона предоставляется на праве собственности. Инженерные коммуникации на земельных участках отсутствуют.

Организатор аукциона: ГП «Гродненский центр недвижимости».

При оформлении заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет:

1) Копии платежных поручений о внесении **задатка, 4-х базовых величин** за подачу заявления на расчетный счет 3012000006896 в фил. 426 АСБ «Беларусбанк», код 199, УНП 590727594 получатель – ГП «Гродненский центр недвижимости», с отметкой банка-отправителя об их исполнении.

Юридическое лицо: доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда данное юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов.

Физическое лицо: паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

2) Платеж за объект осуществляется по безналичному расчету в расчетных билетах Национального банка РБ в течение 30-ти календарных дней с момента проведения аукциона.

3) В случае победы на аукционе победитель возмещает расходы, связанные с проведением аукциона.

4) Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с объектами.

5) Аукционные торги состоятся при наличии не менее 2-х участников по выставленным лотам.

Аукцион состоится 2 декабря 2008 года в 12.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2. Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2, каб. № 57, в рабочие дни с 8.30 до 17.30. **Заявления принимаются с 3 ноября по 26 ноября 2008 г.**

Телефон для справок в Гродно: (0152) 720546. Адрес сайта: www.gorod.grodno.by

Уважаемые акционеры ОАО «Знамя индустриализации»

19 НОЯБРЯ 2008 ГОДА СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ ОАО «ЗНАМЯ ИНДУСТРИАЛИЗАЦИИ» ПО АДРЕСУ: г. ВИТЕБСК, ул. ГАГАРИНА, 11, ЗАЛ ЗАСЕДАНИЙ.

Повестка дня собрания:

1. О субсидии на безвозвратной основе из инновационного фонда концерна «Беллегпром» в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 25 августа 2006 года № 528 «О некоторых мерах по стабилизации финансового положения отдельных организаций».
2. Об увеличении уставного фонда Общества путем дополнительного выпуска акций на сумму субсидии, предоставленной из инновационного фонда концерна «Беллегпром».
3. Об утверждении решения о дополнительном выпуске акций.
4. Об утверждении изменений в Устав Общества и утверждение Устава Общества в новой редакции.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Витебск, ул. Гагарина, д. 11, каб. 34 в рабочие дни с 11 по 18 ноября (время работы: с 9.00 до 16.00), либо 19 ноября 2008 года по месту проведения собрания.

Регистрация участников собрания с 13.00 до 13.45 по месту проведения собрания.

Начало работы собрания — 19 ноября 2008 г. в 14.00.

Список акционеров для участия в собрании составлен по состоянию на 4 ноября 2008 года.

Для регистрации иметь при себе следующие документы:
- акционеру Общества — паспорт,
- представителю акционера — паспорт и доверенность.

Наблюдательный совет ОАО «Знамя индустриализации». УНН 300200360

Усміхнёмся!

Жанчына прыйшла ў міліцыю.

— У мяне знік муж, вось ужо чацвёрты дзень.

— Пішыце заяву.

Напісала, падае, прачыталі.

— Што яму перадаць, калі мы яго знойдзем?

— Перадайце ў першую чаргу, што мама не прыедзе...

☺

Маленькія хітрасці.

Каб госці не сумавалі — трэба расказаць ім анекдот.

Калі яны не сыходзяць — трэба расказаць яго яшчэ раз.

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Сканворд (18 кастрычніка). Па гарызанталі: Крысталінская. Арол. Клан. Пас. Марс. Мус. Ружа. Ядро. Печ. Мурог. Фанфара. Шар. Лага. Алей. Абярэмак. Плато. Рэклама. Фа. Вуячыч. Алах. Латка. Асіна. Сага. Поспех. Куба. Юнак. Мулявін. **Па вертыкалі:** Эпіграф. Абпал. Ажына. Ял. Рант. Паштэт. Кліп. Афера. Мова. Апал. Чарга. Соска. Рапс. Кляча. Пук. Ікона. Глеб. Суд. Рыба. Хам. Рэч. Кома. Лаплас. Маршал. Алі. Герман. Бернэс. Грай. Аха.

Сканворд (25 кастрычніка). Па гарызанталі: Канал. Мядзведзь. Татамі. Водар. Лось. Корж. «Ася». Эрг. Здор. Юнга. Кум. Аід. Адат. Джыгіт. Секанс. Манюка. Бот. Кар. Базіс. Кнот. Крама. Ніл. Зубр. Рызыка. Страх. Ястык. Кадр. Манро. Касметыка. **Па вертыкалі:** Вобла. Адам. Аскет. Сенцы. Глюкоза. Хакі. Катух. Лот. Твар. Воўк. Краска. Метэор. Танк. Джэм. Выдра. Дамка. Крос. Рагач. Бар. Вена. Ядза. Драбіны. Ода. Носік. Бабёр. Тэст. Лампада.

Ніколі ў Бога не прашу нічога –
Нашто мне той залішак, калі маю
Акраец хлеба, дальнюю дарогу
І Маці, што мяне заўжды чакае.

Дарога скончыцца – знайду другую,
Хлеб скончыцца –
ізноў узыдзе зерне, –
Пра гэта я ў жыцці не пашкадую...
...не стане Маці –
нават Бог не верне.

БРЫГАНЦІНЫ

Бяседныя ПЕСНІ

Моладзь з радасцю прыняла песню «Брыганціны», напісаную маладымі аўтарамі Ігарам Лучанком і Валянцінам Лукшам. Гэта была адна з першых беларускіх юнацкіх песень, якая годна ўвайшла ў песенную прастору 60-х гадоў мінулага стагоддзя, дзе ўладарыла рускамоўная стыхія, і суладна паядналася з вольналюбнымі памкненнямі грамадства.

Дух рамантыкі, мажорны настрой, камсамольская ўпэўненасць жывілі маладзёжны рух і вобразна перадаваліся ў вакальных творах. І песня «Брыганціны», асветленая іскрыстым талентам кампазітара, прыкметна запрамянілася на эстрадзе, у вандроўках, інтэрнатах. А студэнцкія будатрады вывезлі яе далёка за межы роднага краю. Цяпер на бяседзе яна гучыць як песня-ўспамін для старэйшага пакалення і як песня-натхняльніца для сучасных юнакоў і дзяўчат.

Верш Валянціна ЛУКШЫ

Стаяць на рэйдзе нашы брыганціны,
Стаяць і морам трызняць каравелы.
І сотні вёрст, і сотні дзён
прайсці нам,
Калі яны падымуць крылы белыя.

Прыйшлі ў свае сямнаццаць
да прычала,
Прыйшлі, на іх глядзім маўкліва,
строга.
І сто вятроў са ста дарог крычала,
І клікала далёкая дарога.

Хай сняцца нам прасоленыя ветры
І песні будзяць жартуна Нептуна,

Музыка Ігара ЛУЧАНКА

Шукаем ключык залаты ад ветраў,
Капрызная нам скорыцца фартуна.

Яе прытулім дужымі рукамі,
Фартуну мы прымусім усміхнуцца,
І падарожны вецер будзе з намі,
Пад ветрам нам ніколі не сагнуцца.

Стаяць на рэйдзе нашы брыганціны,
Стаяць і морам трызняць каравелы.
І сотні вёрст, і сотні дзён
прайсці нам,
Калі яны падымуць крылы белыя.

Падрыхтаваў Міхась ШАВЫРКІН.

Віншуем любую ***Валянціну Віктараўну МАЛЫШЭЎСКУЮ з юбілеем.*** *Жадаем шчасця і здароўя, дабрабыту і радасці, доўгіх гадоў жыцця.* **Дачка, зяць, мама і ўнукі,** *в. Казловічы.*

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

ДЗЕВЫ НЕ ПАВІННЫ ПРЫМАЦЬ ПАСПЕШЛІВЫХ РАШЭННЯЎ, А ВАДАЛЕЯЎ ЧАКАЕ ЦІКАВАЯ РАБОТА

БАРАН. Цяпер можаце ўздыхнуць спакойна: вы практычна вырашылі ўсе праблемы, якія назапасіліся. Засталіся толькі нязначныя недапрацоўкі. Прысвяціце больш часу адпачынку. У аўторак можаце атрымаць цікавую і важную інфармацыю. У сераду і чацвер супрацьпаказаны справы, якія звязаны з агнём, металам і вострымі інструментамі.

ЦЯЛЕЦ. Знойдуцца арыгінальныя рашэнні для старых праблем. Адна з галоўных задач — усвядоміць, што практычна ўсё залежыць ад вас. Добры перыяд для духоўных пошукаў і творчых авантур. Творчы парыў завершыцца цікавымі вынікамі. Верагодна прапанова новай высокаплатнай работы. Гэта ўдалы момант, калі можна карэктаваць свой лёс.

БЛІЗНЯТЫ. Вы мэтанакіраваныя і рашуча настроеныя. Упэўненасць у сабе прыдае сілы. Душэўная раўнавага дазволіць бачыць і чуць цікавыя рэчы. Прыслухайцеся да ідэй калег — яны могуць натхніць нестандартнай думкай і з'явіцца вытокам перспектыўных планаў. Знайдзіце дастаткова часу, каб адкрыць у сабе новую крыніцу натхнення.

РАК. Добрым тыдзень будзе для тых прадстаўнікоў знака, хто прывык быць актыўным і любіць пазмагацца з цяжкасцямі. А іх будзе дастаткова, і першая, яна ж галоўная — лянота. Калі ўдасца перасіліць яе і справіцца з дрэнным настроем, разуменнем таго, што вашу работу за вас усё роўна ніхто не зробіць, будзе не больш чым адным са стымулаў да работы.

ЛЕЎ. Адналькава значныя і сацыяльны статут, і добрыя адносіны з роднымі. Узрастае сіла пераканання, якая дапамагае ўсталёўваць новыя карысныя сувязі. У аўторак не асцерагайцеся ўплыву вышэйшага кіраўніцтва і дзейнічайце зыходзячы з грамадскіх інтарэсаў. Адстойвайце сваё асабістае меркаванне ў гэтым пытанні.

ДЗЕВА. Калі вы даўно збіраецеся штосьці ажыццявіць, то надыходны тыдзень прыдатны для гэтага лепш за ўсё. Практычна любое пытанне сустрэнуць з радасцю, і недахопу ў аднадумцах не будзе. У панядзелак асцерагайцеся паспешлівых рашэнняў. У чацвер могуць напомніць пра сябе незавершаныя справы на рабоце. У другой палове нядзелі дзеці могуць паведаміць штосьці важнае.

ШАЛІ. Ёсць чым ганарыцца, аднак сваімі бліскучымі поспехамі і дасягненнямі вы яшчэ не заслужылі ўсеагульнага прызнання на ўсё жыццё. І вам зноў і зноў давядзецца збірацца з сіламі, завязваць сябе вузлом, забіваць волю ў кулак, словам, рабіць усё, што належыць, каб дасягнуць чарговай з вызначаных вышыняў.

СКАРПІЁН. Тыдзень прынясе новыя выццёвыя ўстаноўкі. Старайцеся не губляць дарэмна каштоўны час. Усё задуманае можа ажыццявіцца, калі вы спакойна і дакладна будзеце рабіць сваю справу. Не варта пачынаць новыя праекты ў панядзелак. У гэты дзень лепш нічога не планаваць. Варта праверыць надзейнасць партнёраў.

СТРАЛЕЦ. Імкнучыся навучыцца чаму-небудзь, пазнаёмцеся з чалавекам, які добра ўмее гэта рабіць. Самавучыцелі не дапамогуць. У панядзелак нечаканы паварот падзей адкрые новыя магчымасці. У аўторак да вас наведаецца творчае натхненне. У пятніцу не размаўляйце з падазронымі асобамі.

КАЗЯРОГ. Не варта спяшацца з высновамі і тым больш — з рашэннямі, якой бы зразумелай ні падавалася сітуацыя. Абавязкова знойдзецца няўлічаны нюанс, які расфарбуе карціну зусім інакш. Прыслухайцеся да голасу інтуіцыі, яна падкажа самае правільнае рашэнне, але не ажыццяўляйце яго раней за пятніцу.

ВАДАЛЕЙ. Дастаткова напружаны тыдзень, які дазволіць рэалізаваць шматпланавыя магчымасці. У аўторак могуць прапанаваць цікавую работу. У сераду з-за неасцярожнага слова могуць узнікнуць нацягнутыя адносіны з калегамі. У чацвер могуць успыць старыя нявырашаныя праблемы.

РЫБЫ. З'явіцца шанц максімальна поўна выкарыстаць свае магчымасці для завяршэння многіх важных і адказных спраў. Менавіта ў гэты час удасца аб'яднаць ідэі з практыкай, а мары ператворыць у рэчаіснасць. Цяпер асабліва важна партнёрства ў дзелавой сферы. У пачатку тыдня верагодныя недакладнасці ў інфармацыі, якія могуць збіць з толку.

ШАХМАТЫ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Уладзіміра СЫЧОВА

КОНКУРС РАШЭННЯЎ

Заданне № 17



(4+3). Выйгрыш.

Заданне № 18 (заключнае)

(5+5). Нічыя.

Час на абдумванне рашэння эцюдаў — тры тыдні з дня апублікавання заданняў.

У ГОНАР А.П. САКОЛЬСКАГА

У Мінску ў шахматным клубе падшыпнікавага завода 12 кастрычніка праводзіліся вочныя спаборніцтвы па рашэнні шахматных кампазіцый, прысвечаныя 100-годдзю з дня нараджэння вядомага майстра спорту СССР, заслужанага трэнера СССР, шахматнага тэарэтыка, шматразовага пераможцы спаборніцтваў па шахматах Аляксея Паўлавіча Сакольскага (1908 — 1969). Ён жыў і працаваў у Мінску з пачатку 50-х гадоў. У яго гонар праводзіліся з 1970 па 1987 гг. мемарыяльныя спаборніцтвы. А.П. Сакольскі быў аўтарам многіх кніг.

Сёлетнія спаборніцтвы па шахматнай кампазіцыі праводзіліся ў два туры — кожны тур па шэсць кампазіцый. Былі прапанаваны па два творы ў кожным жанры.

Пераможцам, як і чакалася, стаў вядомы рашальнік міжнародны майстар па рашэнні шахматных кампазіцый Аляксандр Булаўка з Клічава, які набраў 38 ачкоў з 60 магчымых. Другое месца заняў Мікалай Сігневіч з Мінска — 34 ачкі, трэцяе — Аляксандр Міхалап з Клічава — 30,5, чацвёртае — Віктар Зайцаў з Гомеля — 25,5, пятае — Уладзімір Барташ з Мінска — 20.

Пераможцы былі ўзнагароджаны кубкамі і шахматнай літаратурай. Трэба адзначыць, што дакладна і арганізавана правяла спаборніцтва судзейская калегія.

Прыводзім для рашэння адзін эцюд з гэтага спаборніцтва.

(5+9). Выйгрыш.

Чакаем вашых адказаў.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.10	16.35	9.25
Віцебск —	7.04	16.21	9.17
Магілёў —	7.01	16.25	9.24
Гомель —	6.53	16.26	9.33
Гродна —	7.25	16.51	9.26
Брэст —	7.21	16.56	9.35

Месяц

Першая квадра.
Месяц у сузор'і Стральца.

Імяніны

Пр. *Клеапатры, Івана.*
К. *УРАЧЫСТАСЦЬ УСІХ СВЯТЫХ.*

НАДВОР'Е на заўтра

...у суседзяў

ВАРШАВА +12..+14°С	КІЕЎ +16..+18°С	РЫГА +6..+8°С
ВІЛЬНЮС +7..+9°С	МАСКВА +5..+7°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ +4..+6°С

НЕСПРЫЯЛЬНЫЯ ДНІ І ГАДЗІНЫ ЛІСТАПАДА

2, нядзеля, 8.30—10.00
4, аўторак, 8.00—22.00
7, пятніца, 8.30—11.30
9, нядзеля, 15.30—18.00
11, аўторак, 18.30—20.00
13, чацвер, 16.00—19.00
15, субота, 18.00—19.30
17, панядзелак, 12.30—20.00
26, серада, 11.30—23.00
27, чацвер, 0.00—4.30
29, субота, 0.00—16.30

Дзве даты

1 лістапада

1908 год — 100 гадоў з дня нараджэння беларускай паэтэсы Яўгеніі Пфляўбаўм. На пачатку 30-х гадоў мінулага стагоддзя працавала ў рэдакцыі «Звязды», у 1933-м выехала ў Сібір услед за сваім рэпрэсаваным мужам, пісьменнікам Максімам Лужаніным. Пасля вайны жыла ў Мінску. Аўтар паэтычных зборнікаў «Сувой жыцця», «На заходзе сонца».

1604 год — у Лонданскім тэатры «Уайтхол» адбылася прэм'ера трагедыі Шэкспіра «Атэла».

Цытата дня:

«Мужчына шукае каго-небудзь, перад кім ён мог бы ганарыцца; жанчына шукае плячо, да якога яна магла б прыхінуцца».

Генры Менкен (1880—1956), амерыканскі крытык.

У ДОБРЫ ШЛЯХ

Сярод славян добра ведалі, што ад'язджаць далёка з дому неабходна было ў пэўныя дні тыдня — аўторак і чацвер. Асабліва неспрыяльным днём для далёкай дарогі лічылі панядзелак: «ад'язджаць у дарогу ў панядзелак нельга, у гэты дзень плёну не будзе», «нават цыган не запрагае каня ў панядзелак».

● У дні, калі святкавалі пачатак года (Каляды), заканчэнне жніва, у дзень Раства Хрыстовага і Багародзіцы і інш. Вялікія святы, сям'я павінна была быць дома ў поўным складзе. Таму ў такія святочныя дні звычайна ніколі нікуды не збіраліся.

● Катэгарычна забаранялася месці і мыць падлогу ў той дзень, калі хтосьці са сваякоў некуды ад'язджаў. Лічылася, што тым самым саб'еш яго са шляху, і ён будзе няўдалым. Акрамя таго, лічылася, што ў гэтым выпадку адкрываеце шлях у свет продкаў, і можна «вымесці» з хаты гаспадара ці гаспадыню.

● Самай распаўсюджанай негатыўнай прыкметай і сёння з'яўляецца неабходнасць вярнуцца з паловы шляху: не будзе шанцаваць у такой паездцы.

● Не менш важным было ў пабудове вясельнага «маршруту» зрабіць так, каб «вясельны» і «пахавальны» шляхі не сустракаліся (не перакрыжоўваліся). Сустрэча вясельнага картэжу і пахавальнай працэсіі была даволі непажаданай — яна прадказвала смерць першага дзіцяці ў сям'і маладых. Нездарма шлях ад дома да могілак маркіравалі галінкамі елкі. Хадзіць па гэтай «дарозе смерці» катэгарычна забаранялася.

«НАРОДНЫ ЭТЫКЕТ»

● Пераход дарогі перад ідучым, едучым чалавекам, жывёлай, пахавальнай ці вясельнай працэсіяй у народнай культуры заўсёды выклікаў негатыўныя адносіны. Лічылася, што толькі дрэнны чалавек будзе рабіць такія дзеянні, каб адняць здароўе, наслаць порчу, адняць малако ў каровы, перашкодзіць вяселлю і г.д.

● Верхам непавагі лічылася перайсці каму-небудзь дарогу з пустым вядром. Да такога чалавека ставіліся вельмі негатыўна, выключалі яго з усіх рытуальных дзеянняў у вёсцы.

● У час вяселля ці іншых рытуальных ці побытавых дзеянняў (кіруючыся ў далёкі шлях, на поле сеяць, жаць і г.д.) строга сачылі, каб ніхто не «перайшоў шчасце-долю».

● Лічылася, што чалавек, які пяройдзе дарогу пахавальнай працэсіі, хутка сам захварэе і памрэ.

● Перанос рэчаў, як і пераход цераз дарогу — своеасаблівую сімвалічную мяжу, ва ўсходніх славян таксама выклікаў шэраг перасцярог. Так, паўсюдна існавала забарона пазычаць што-небудзь суседзям, якія жывуць цераз вуліцу (цераз дарогу), а вось суседзям, якія жывуць з вамі на адным баку вуліцы — дазвалялася.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Хэлоўін ці Урачыстасць Усіх Святых?

Што такое Хэлоўін? Для адных — гэта маргінальная з'ява ў беларускай культуры, не вартая ўвагі. Для іншых — гэта нагода «проста» забавіцца і пагуляць. Але ці добрая гэта нагода для забавы, і ў чым прымаюць удзел некаторыя хрысціяне, «святкуючы» Хэлоўін?

Як вядома, маскарадзе «святкаванне» апошняга дня кастрычніка прыйшло да нас пад уплывам сучаснай амерыканскай культуры. Назва гуляння — «Halloween» — паходзіць ад скарачэння двух выразаў: «All Hallow Day» (Дзень Усіх Святых) і «All Hallow Evening» (Вечар Усіх Святых).

Урачыстасць Усіх Святых, якую Касцёл адзначае 1 лістапада, была перанесена ў IX ст. на гэты дзень дзеля таго, каб перамагчы ў свядомасці людзей страх перад язычніцкім павер'ем аб магутнасці цемры і яе перамозе над сіламі святла ў ноч на 1 лістапада.

Паводле старажытнакельцкіх павер'яў, 31 кастрычніка памірае бог Святла і надыходзіць валадарства бога Цемры. Вечарам таго ж дня пачынаецца валадаранне Цемры, з Апраметнай выходзяць цёмныя духі. Каб выпрасіць літасці ў бога Цемры, кельты палілі вогнішчы, прыносілі яму ахвяры. А самі яны пераапраналіся ў пачварныя касцюмы, каб злыя духі прынялі іх за сваіх і не чапалі.

Сучасны чалавек, які лічыць сябе прагматыкам і бізнэсменам, прывык усё перакладаць на грашовыя велічыні. Хэлоўін разглядаецца такімі людзьмі як нагода да добрага заробку (або правільнага ўкладання грошай) ад арганізацыі яшчэ адной забаўляльнай акцыі. Арганізатары зарабляюць, а народ бавіцца. Але за гэтымі нявіннымі забавамі крыецца глыбока адмоўная рэчаіснасць. Нават знешняя атрыбутыка Хэлоўіна скіравана на культ смерці, страху, магіі. Ці можа хрысціянін удзельнічаць у неаязычніцкіх гуляннях? Як гэта ні парадаксальна, але ў XXI ст. мы вяртаемся да таго самага пытання, якое задавалі апосталам і іх наступнікам першыя пакаленні вучняў Хрыста. Адказ быў адназначны: «не». І гэта «не», якое не абмяжоўвае, але вызваляе. Справа не ў саміх забавах, але ў тым, у што мы гуляем і як гуляем. Сапраўдны хрысціянін ведае, што зло — гэта не цацка, што выкліканне злых духаў і ўдзел у дэманічных маскарадах — гэта не гульня.

Ксёнз Аляксандр АМЯЛЬЧЭНЯ, Адказны за СМІ пры Сакратарыяце Канферэнцыі Каталіцкіх Біскупаў у Беларусі.

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

БЕЗ РЭЦЭПТА

Не мінайце рабіны

З чырвонай рабінай звязана шмат народных абрадаў і павер'яў. Гэта дрэва — сімвал сямейнага шчасця. Таму раней у час вяселляў яе ягадамі ўпрыгожвалі сталы, абсыпалі маладых. Лічыцца, што засушаныя галінкі і яркія гронкі рабіны — выдатнае ўпрыгажэнне для спальні. Пастаўце некалькі галінак у галаве сямейнага ложка, і ваш шлюб будзе доўгім і шчаслівым.

Дзесяць ягад штодня

З'ядайце ўсяго дзесяць ягад рабіны на працягу дня, і вы надоўга забудзеце пра галаўны боль, бяссонніцу і павышаны крывяны ціск, сцвярджаюць траўнікі. Рабіну здаўна цанілі ў народзе як лекавы сродак, у першую чаргу жаўцягонны. Нядаўна вучоныя выявілі, што многія яе «чароўныя» ўласцівасці звязаны з вялікай наяўнасцю сарбіту, які паніжае колькасць тлушчу ў печані і халестэрыну ў крыві. Аскамістыя ягады рабіны ратуюць і ад авітамінозу. У іх ёсць вітаміны С, Р, B_2, Е, карацін, фоліевая кіслата, арганічныя кіслоты, цукры, дубільныя рэчывы, эфірныя алеі. Сухія і свежыя ягады рабіны разам з крапівой і пладамі шыпшыны выкарыстоўваюць для прыгатавання вітамінная напою. Вазьміце 7 частак ягад рабіны і 3 часткі лісця крапівы (ці плады рабіны і шыпшыны ў роўных частках). 1 ст. лыжку сумесі заліце 2 шк. гарачай вады, гатуйце 10 хвілін, настойвайце 4 гадзіны. Піце па 0,5 шк. два-тры разы на дзень.

Многа ў рабіне і мікраэлементаў, асабліва ёду, кальцыю, магнію, марганцу, форсфару, а жалеза — у 4 разы больш, чым у яблыках. З рабіны гатуюць лекавыя настойкі, напіткі, гарбату, вараць жэле, варэнне, сокі. Так, сок са свежых ягад рэкамендуецца прымаць пры паніжанай кіслотнасці страўнікавага соку — па 1 ч. лыжцы перад ядой.

Паколькі ягады рабіны багатыя на ёд, іх варта ўжываць пры некаторых захворваннях шчытападобнай залозы і гіпертаніі. Існуе народны сродак і для выдалення бародавак. На іх трэба нанесці масу з сырых ягад рабіны, перавязаць на ноч, а зранку старанна прамыць скуру. Такія працэдуры трэба рабіць 8—10 разоў. Рабіна дапамагае справіцца з таксікозам будучым мамам. Разатрыце 2 ч. лыжкі рабіны з цукрам і з'ешце пры ванітах. А вось людзям з паніжаным ціскам захапляцца рабінай не варта.

ДАПАМАЖЫ САБЕ САМ

Не прастудзе!

Адчуваеце, што падхапілі прастуду? Тут жа скарыстайце прыёмы тыбецкага масажу. Магчыма, яны дапамогуць вам пазбегнуць насмарку і кашлю.

Дзеянне 1. Націсніце пальцамі на пераносе, пасля чаго, узмацняючы і паслабляючы націсканні, перамяшчайце пальцы ўздоўж броваў, уніз да скроняў і далей вакол вачэй.

Дзеянне 2. Лёгка пагладжвайце нос — знізу ўверх, вакол вачэй і зноў ніз носа. Пастукайце сярэднім пальцам, як малаточкам, па носе. Зморшчыце нос; на ўдыху надзьміце ноздры, а потым, амаль стуліўшы, зрабіце энергічны выдых. Патрыце ўказальным пальцам перагародку паміж ноздрамі, злёгку ўзнімаючы кончык носа. Зацісніце левую ноздру, зрабіце ёю выдых, а правай удыхніце, і наадварот.

Дзеянне 3. Прамармычыце на выдыху любую мелодыю.

-2536-

МЕНЮ ЗДАРОЎЯ

Добрае слова качану

Звычайная і даступная на працягу ўсяго года капуста насамрэч — унікальны прадукт. Вучоныя даказалі, што калі рэгулярна ўключаць яе ў свой рацыён, паніжаецца верагоднасць захворвання на рак. Капуста — добрая крыніца бэта-караціну, таму яна станоўча ўплывае на зрок. І свежая, і квашаная капуста карысная для работы кішэчніка. Яна змяшчае шмат клятчаткі і павялічвае аддзяленне страўнікавага соку. У капусце ёсць жалеза і калій, якія павышаюць жыццёвы тонус і паляпшаюць работу сэрца.

Вылучаецца капуста і павялічанай колькасцю бялкоў, якія добра збалансаваныя па складзе амінакіслот, таму набліжаюцца да тлушчавых бялкоў. З гэтай сціплай агародніны можна прыгатаваць шмат розных смачных і карысных страў.

Фаршыраваны качан

Для фаршыравання лепш за ўсё прыдатны рыхлы качан, які гаспадыні звычайна не мілуюць. Разрэжце яго напалам, заліце кіпенем, крыху патрымайце ў ім, а потым акуратна адцісніце. Лісце выпрастайце і паміж імі пакладзіце любую начынку, прыгатаваную на ваш смак.

Капуста з мясам

400 г капусты, 3 памідоры, 300 г свініны, 3 невялікія бульбіны, 1 ст. лыжка алею, 2 шк. булёну, 1 цыбуліна, соль на смак.

Парэжце цыбулю, абсмажце ў глыбокай патэльні. Нашаткуйце капусту, здрабніце бульбу, дадайце да цыбулі. Уліце ў агародніну падсолены булён, крыху патушыце. За пяць хвілін да гатоўнасці дадайце парэзаныя частачкамі памідоры і кавалкі смажанага мяса.

Вараная капуста з курыцай

50 г курыцы, 125 г свежай капусты, 80 г бульбы, 25 г цыбулі, 25 г морквы, 10 г масла, часнок, соль, перац, аліўкі на смак.

Зварыце курыны булён. Як толькі курыца зварыцца, дастаньце яе з каструлі і астудзіце. Дробна пашаткаваную капусту і нарэзаную бульбу пакладзіце ў кіпячы булён. Варыце да гатоўнасці. У гэты час абсмажце цыбулю і моркву на масле і за 5—10 хвілін дадайце ў каструлю, пасаліце. Раздзяліце мяса курыцы на вузкія кавалкі рукамі і таксама пакладзіце ў каструлю. Падавайце капусту гарачай, упрыгожыўшы алівамі. Асобна пастаўце на стол часнок, смятану, зеляніва, чорны хлеб.

Практычныя парады

● Каб пазбавіцца ад капуснага паху, які з'яўляецца ў час гатавання, дадайце ў ваду крыху віна ці часнаку.

● Пры тушэнні галубцоў не наліваўце многа вады ці булёну — галубцы атрымаюцца вадзяністымі і нясмачнымі.

● Капусту лепш тушыць з воцатам, тады яна не будзе занадта мяккай. Квацістую капусту можна тушыць у малацэ.

● Капуста, заквашаная качанамі, будзе больш пругкай, калі рады качаноў перасыпаць буйнатоўчаным зернем кукурузы.

Штрудзель з капустай

200 г мукі, 1 яйка, 4 ст. лыжкі алею, 3 ст. лыжкі вады, соль.

Для начынкі: *800 г капусты, па 1 морквіне і цыбуліне, 100 г масла, пучок пятрушкі, 2 яйкі, 0,5 шк. вяршкоў, соль, чырвоны молаты перац.*

З вады, яйка, солі і мукі замясіце цеста, змажце алеем, пакіньце на 30 хвілін. Абсмажце да напаўгатоўнасці капусту, моркву і цыбулю. Дадайце пятрушку, соль, перац. Змяшайце з вяршкамі, узбітымі з яйкамі. Тонка раскачайце цеста і перакладзіце яго начынкай. Выпякайце ў духоўцы.

-2537-

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.350 Індэкс 63850. Зак. № 6053. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12